УМОВЫ ПАДПІСКІ
(з дармовым дадаткам „Прафрух")

На 1 мес.	90 к.
„ 3 мес.	2 р. 60 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ
За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. надбавкі.

Эпл. Москва, Библиотека ВОНХ СССР
Ст. Сьн /Зв. I/

ЗЬВЯЗДА
Орган Цэнтральнага Камітэта Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсактар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Навны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

ПЯТНІЦА 30 мая 1930 г.
№ 124 (3722)
Год выданьня—XIV.
РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА
МЕНСК, Савецкая, 63.

Загартаваная ў непрымірымай барацьбе за генэральную лінію партыі супроць правага і „левага" апартунізму, супроць нацыянал-дэмакратызму і шавінізму ўсіх колераў--КП(б)Б маналітным атрадам, згуртаваная вакол бальшавіцкага ЦК, прышла да свайго XIII зьезду

Вышэйшаму органу КП(б)Б—XIII зьезду—бальшавіцкае прывітаньне

ДА XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

Сёньня адкрываецца XIII зьезд КП(б)Б. Партыя прыходзіць да зьезду са значнымі посьпехамі. Валавая прадукцыя прамысловасьці за першае паўгодзьдзе 1929-30 г. узрасла па 72,1 проц. Капітальныя ўкладаньні ў прамысловасьць ўзрасьлі ў два разы. Гэта сьведчыць аб няўхільным выкананьні задач індустрыялізацыі, якая ажыцьцяўляецца шпаркімі тэмпамі. У галіне сельскай гаспадаркі мы маем масавы рух бядняцка-серадняцкіх пластоў вёскі ў калгасы. Сацыялістычнае перабудаваньне сельскае гаспадаркі значна прасунулася ўперад.

Есьць і недахопы ў рабоце: прамысловасьць адстае ў справе зьніжэньня сабекошту, якасьць прадукцыі застаецца нізкай. Прафэсыянальныя саюзы не перабудавалі свае работы, не павярнуліся «тварам да вытворчасьці» і невыстарчальна ахапілі той уздым актыўнасьці рабочае клясы, які ў асноўным забясьпечыў посьпехі нашага прамысловага разьвіцьця.

Пры правядзеньні калектывізацыі мы прайшлі праз паласу «галавакружэньня ад посьпехаў», мы мелі рад перагібаў і скрыўленьняў партыйнай лініі і толькі рашучае іх выпраўленьне і барацьба за ажыцьцяўленьне ленінскіх прынцыпаў добраахвотнасьці ў калгасным руху забясьпечылі далейшае ўзмацненьне і разгортваньне калгаснага будаўніцтва.

У барацьбе са ўсякага роду ўхіламі ад генэральнай лініі—партыя таксама дабілася значных посьпехаў. Разьбіўшы нагалаву контр-рэвалюцыйны трацкізм, партыя нанесла руйнуючы ўдар па правым ухіле — галоўнай небясьпецы на даным этапе. Пасьляховая барацьба з «прышчэпаўчыкамі» сьведчыць аб тым, што барацьба з правым ухілам вялася пасьлядоўна ў тэорыі і на практыцы. Партыя рашуча змагалася з нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал-апартунізмам, па-бальшавіцку раскрытыкавуўшы народніцкія дробна-буржуазныя тэорыі, посьбіты якіх ад руку з правымі апартуністымі стараюцца павярнуць партыю на шлях разьвіцьця капіталістычных элемэнтаў у краі. Дасягненьні партыі ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва ўзмацнілі рост прамысловага пралетарыяту і стварылі ў вёсцы моцнае калгаснае ядро.

Такім чынам, агульныя вынікі работы КП(б)Б за мінулы пэрыяд сьведчаць аб няўхільным выкананьні асноўных задач партыі і вялікай рабоце, праробленай ёю ва ўмовах абвостраных клясавай барацьбы. Задача XIII партыйнага зьезду будзе, аднак, заключацца ня толькі ў ацэнцы дасягненьняў і ўстанаўленьня недахопаў. Галоўная задача зьезду заключаецца ў тым, каб паказаць шляхі далейшай работы.

Першае, што неабходна пры гэтым прыняць над увагу — узмацненьне права - апартуністычнай небясьпекі. Старая плятформа правых даволі дыскрэдытавана ў радох партыі. Правы апартунізм праяўляецца зараз у новых формах, часта старанна маскуючы свой твар. У першую чаргу правыя апартуністы робяць спробы дыскрэдытаваць партыйнае кіраўніцтва. Гэтыя спробы выражаюцца ў імкненьні вытлумачыць усе перагібы і скрыўленьні лініі партыі памылкамі кіраўнічых цэнтраў партыі, апрапаючыся часамі ў форму беспрынцыпнай дэмагогіі. Правыя апартуністы прабуюць замазаць, затушаваць асноўны лёзунг партыі аб ліквідацыі кулацтва, як класы, на базе суцэльнай калектывізацыі. У калгасным руху яны прапаведуюць тэорыю «самацёку», пашыраюць папікерскія чуткі аб «адступленьні», адмаўляючыся ў практычнай рабоце падтрымліваць і разьвіваць будаўніцтва калгасаў. У гэтых новых формах ня трудна пазнаць знаёмыя ўстаноўкі на разьвіцьцё капіталістычных элемэнтаў у вёсцы.

У пытаньнях індустрыялізацыі краю правыя апартуністы паранейшаму прапаведуюць раўненьне на «вузкія месцы», імкнуцца пад прыкрыцьцем «дзелавых» довадаў і дзяліцкіх разважаньняў паслабіць тэмпы індустрыялізацыі.

Недаацэнка работы з беднатой, пагардлівасьць да гэтай работы зьяўляюцца таксама характэрнай рысай правага апартунізму.

Асаблівасьцю правай небясьпекі ў даны момант зьяўляецца цеснае перапляценьне яе з «левымі» адхіленьнямі ад партыйнай лініі. Узаемаадносіны правага ўхілу і «левых» загібаў заключаюцца зараз ня толькі ў тым, што «левыя» загібы жывяць правую небясьпеку, узмацняючы праваапартуністычныя тэндэнцыі і даючы лішні аргумант у рукі правых апартуністых: правыя і «левыя» ўхілы пераплятаюцца часамі самым дзіўным чынам, аб'яднаючыся там, дзе гутарка ідзе аб удары па партыйным кіраўніцтве. Вельмі часта ў такім пытаньні, як пытаньне аб рабоце з вясковай беднатой, «левыя» загібістыя выяўляюць тую-ж самую недаацэнку і пагардлівасьць да гэтай работы, якія ўласьцівы правым ухілістым.

Для ўсіх відаў апартунізму характэрным зьяўляецца расплыўчатасьць, неакрэсьленасьць, схільнасьць да агаворак, уступак і кампрамісаў. Маскуючыся фармальным прызнаньнем генэральнай лініі партыі, маскуючыся прызнаньнем аспоўных лёзунгаў партыі, апартуністыя імкнуцца прасунуць свае ідэі ў выглядзе рознага роду агаворачак, паправачак і заўваг.

Барацьба з новымі формамі праяўленьня правага ўхілу, які застаецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, і з «левымі» загібамі патрабуе ад партыйнага кіраўніцтва пасьлядоўнасьці, выразнасьці, яснасьці ў фармулёўках задач, якія стаяць перад арганізацыяй. «Калі абвяшчаецца вайна праваму ўхілу — піша т. Сталін — правыя ўхілістыя звычайна перафарбоўваюцца ў прымірэнцаў і ставяць партыю ў затрудняючае становішча». Прымірэнчыя адносіны да праваапартуністычных памылак, прымірэнчыя адносіны да «левых» загібістых, якія супрацьпоўяюцца прызнаньню сваіх памылак, праяўляюцца зараз таксама ў новых формах. Ня будзе перапавялічэньнем сказаць, што адным з галоўнейшых затрудненьняў у барацьбе з новымі замаскаванымі формамі правага апартунізму зьяўляецца імкненьне прымірыць усё і ўся, баязьлівасьць фармуляваць ясна і выразна асноўныя палітычныя задачы дня.

XIII зьезд партыі павінен будзе рашучым чынам мабілізаваць усю партыйную арганізацыю па барацьбу супроць асноўнай небясьпекі — правага ўхілу, на рашучае перамаганьне «левых» загібаў. XIII зьезд павінен будзе выразна, ясна і дакладна фармуляваць задачы партыйнай арганізацыі ў ажыцьцяўленьні генэральнай лініі партыі.

Адзэй з асноўных задач зьезду зьяўляецца забясьпячэньне далейшага разгортваньня самакрытыкі, якая ў нашай рабоце ня была даволі разгорнута.

«Чаго мы чакаем — піша т. Сталін — ад лёзунгу самакрытыкі? Ён павінен, папершае, падняць пільнасьць рабочае клясы, завастрыць яго ўвагу да нашых недахопаў, палегчыць выпраўленьне гэтых недахопаў і зрабіць немагчымымі рознага роду нечаканасьці ў нашай будаўнічай рабоце; ён павінен, падругое, падняць палітычную культурнасьць рабочае клясы, разьвіць у ім пачуцьцё гаспадара краю, узмацніць навучаньне рабочае клясы ў справе кіраўніцтва краём».

Галоўнае ў самакрытыцы — устаноўка на масы, уцягненьне мільённых мас рабочае клясы ў гаспадарчае будаўніцтва, бальшавіцкае выхаваньне кадраў рабочае клясы і партыі. «Нам патрэбна ня ўсякая самакрытыка. Нам патрэбна такая самакрытыка, якая падымае культурнасьць рабочае клясы, разьвівае яе баявы дух, узмацняе яе веру ў перамогу, памнажае яе сілы і дапамагае ёй стаць сапраўдным гаспадаром краю». (Сталін).

Кіруючыся гэтымі асноўнымі палажэньнямі, партыя павінна будзе паставіць ва ўвесь рост задачу разьвіцьця самакрытыкі і барацьбы з яе заціскам. Заціск і перахлёстваньне самакрытыкі прадстаўляюць з сябе розныя формы праяўленьня апартуністычнага скажэньня лёзунгу самакрытыкі. Апартуністыя арганічна супроць самакрытыкі, але ў залежнасьці ад становішча, яны або зацісканць яе, глушачы актыўнасьць рабочых мас, або прабуюць выкарыстаць лёзунг самакрытыкі ў барацьбе супроць партыі.

Вызначаючы далейшыя задачы партыі ў барацьбе з рознага роду скажэньнямі ў нацыянальным пытаньні, неабходна будзе зыходзіць з таго, што беларускі нацыянал-дэмакратызм не разьбіты. Ён адступіў, акапаўся і чакае выгоднага моманту для новай вылазкі. Дыскусія аб мове служыць выразным прыкладам адзэй з гэтых вылазак. Зьезду прыдзецца ўлічыць і тую акалічнасьць, што побач з далейшай барацьбой супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму, усё большая ўвага павінна быць зьвернута барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам, а таксама з шавінізмамі яўрэйскім, польскім і інш. Вялікадзяржаўны шавінізм унікае адкрытых тэарэтычных выступленьняў. Ён абмяжоўваецца роляй практыка, перашкаджаючы беларусізацыі, тармозячы справу культурнага будаўніцтва ў БССР і зрываючы правядзеньне нацыянальнай палітыкі партыі. **Вялікадзяржаўны шавінізм зьяўляецца асноўнай перашкодай для пасьляховай і поўнай перамогі над нацыянал-дэмакратызмам.**

Пасьлядоўнае і правільнае правядзеньне лініі партыі, непрымірымая барацьба з усякага роду адхіленьнямі ад ленінскай лініі забясьпечвае правільнае вырашэньне пытаньняў нашага гаспадарчага будаўніцтва.

Зьезд павінен будзе вызначыць шляхі далейшага прамысловага ўздыму БССР, паказаць мерапрыемствы для разьвіцьця і ўзмацненьня калгаснага будаўніцтва і ўстанавіць асноўныя вехі перабудовы работы прафсаюзаў для таго, каб ахапіць узрастаючую актыўнасьць рабочых мас.

Зьезд дасьць асноўныя кіраўнічыя паказаньні для далейшай работы нашай партыйнай арганізацыі, якая пад выпрабаваным кіраўніцтвам ленінскага ЦК УсеКП(б) пойдзе наперад, да новых посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва.

К. ГЕЙ.

ЗЬЕЗДУ БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫІ

заводы, фабрыкі і калгасы рапартуюць

Разгортваючы барацьбу за прамфінплян, ствараючы новыя брыгады імя XIII зьезду КП(б)Б і XV зьезду УсеКП(б), выконваючы пасеўныя пляны, працоўныя масы дэманструюць сваю адданасьць партыі Леніна

Рапарт 1500

„Кастрычнік"—XIII зьезду

Наш дэвіз—барацьба за пяцігодку

Кіраўніку бальшавіцкай партыі—XIII зьезду КП(б)Б—гарачае пралетарскае прывітаньне ад 1.500 рабочых фабрыкі «Кастрычнік».

Задачы будаўніцтва сацыялізму, задачы індустрыялізацыі нашай краіны поўнасьцю ўсьвядомлены рабочымі фабрыкі «Кастрычнік». Мы за час ад XII зьезду КП(б)Б разам з усёй рабочай клясай пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі напружвалі ўсю сваю сілу і энэргію для практычнага правядзеньня ў жыцьцё пяцігадовага пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі.

Мы разгарнулі па нашай фабрыцы сацыялістычнае спаборніцтва. На фабрыцы ёсьць 1.327 ударнікаў, 8 вытворчых камун і два вытворчыя калектывы.

Пяцігодка за 4 гады—дэвіз ва ўсёй нашай рабоце.

103,2 проц. выпуску прадукцыі і 12,97 проц. зьніжэньня сабекошту за першае паўгодзьдзе 1929-30 г.—наш падарунак XIII зьезду КП(б)Б.

За пэрыяд з XII зьезду КП(б)Б мы са старой, адсталай у тэхнічных адносінах фабрыкі, на якой працавала 300 рабочых, вырасьлі ў буйное сацыялістычнае прадпрыемства з 1.500 рабочымі. Мы перажылі цэлы рад затрудненьняў у нашай рабоце, мы далі рашучы адпор усялякім адсталым рвацкім настроям і пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы з рабочых-краўцоў, раскіданых па цёмных майстэрнях старых «гаспадарыкаў», ператварыліся ў рабочых буйной сацыялістычнай фабрыкі краіны дыктатуры пралетарыяту.

Мы ні на мінуту не забываем агульных задач рабочае клясы і таму актыўна падтрымліваем усе кампаніі і мерапрыемствы, якія праводзяцца камуністычнай партыяй і савецкай уладай.

Рабочыя нашай фабрыкі падпісаліся на 118.000 руб. на трэцюю пазыку індустрыялізацыі. Сваіх лепшых і перадавых рабочых мы аддалі ў лік 25.000 для правядзеньня калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

У часе чысткі партыйных радоў 200 лепшых перадавых ударнікаў падалі калектыўную заяву аб уступленьні ў рады партыі.

Для практычнага выкананьня ўзятых на сябе абавязацельстваў па ажыцьцяўленьні пяцігодкі за 4 гады мы ў гэтым годзе будуем новы вытворчы корпус на 1.000 рабочых, корпус для культурна-бытовога абслугоўваньня рабочых мас, які дасьць магчымасьць яшчэ больш узьняць наш культурны ўзровень і тым самым падрыхтаваць сябе для бабў за справу рабочае клясы.

Мы ўпэўнены, што XIII зьезд КП(б)Б дасьць рашучы адпор усялякім дробна-буржуазным, апартуністычным настроям і па аснове ленінскіх паказаў вызначыць далейшыя шляхі разьвіцьця нашай краіны да поўнай перамогі сацыялізму.

Няхай жыве XIII зьезд КП(б)Б!

Няхай жыве рабочая кляса, якая пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі пераможа, ня гледзячы ні на якія труднасьці!

Менцёры заводу «Камунар», якія абвясьцілі сябе ўдарнікамі імя XIII зьезду КП(б)Б

Ударныя брыгады імя XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б)

Металюргічны завод «ПРАЛЕТАРЫ» (Гомель) ня выканаў поўнасьцю свайго прамфінпляну. У першым квартале «Пралетары» выканаў праграму на 83,2 процантаў, у другім квартале—на 93,2 процантаў. У сакавіку завод выканаў прамфінплян на 96,4 проц.

Прарывы ў выкананьні прамфінпляну ўсхвалявалі рабочую масу. Асноўная маса рабочых разгарнула настойлівую і упартую барацьбу за ліквідацыю прарываў і перавыкананьне прамфінпляну. Зараз уся работа заводу падпарадкавана аднаму лёзунгу, аднэй задачы:

Да XVI зьезду УсеКП(б) ліквідаваць прарывы і перавыканаць прамфінплян па колькасных і якасных паказальніках.

У першых калёнах барацьбітоў заажыцьцяўленьне гэтае задачы ідзе КАЦЕЛЬНЫ цэх. Кацельны цэх ужо дабіўся перавыкананьня прамфінпляну па ўсіх паказальніках. За першае паўгодзьдзе кацельны цэх выканаў праграму на 110,9 проц. Кацельшчыкі ўзьнялі прадукцыйнасьць працы на 34 проц. замест 16 проц., прадугледжаных прамфінпляном.

Ліцейны цэх заводу «Пралетары» значна адстаў ад кацельнага і цягнуўся ў хвасьце. Ліцейшчыкі выпускалі прадукцыю дрэннай якасьці, што моцна адбівалася на рабоце кацельнага цэху.

Кацельны цэх арганізаваў паход у чыгуна-ліцейны цэх, дзе кацельшчыкі адкрыта заявілі рабочым ліцэйнага цэху:

— Мы дабіліся ліквідацыі браку ў нашым цэху. Гультаёў і прагульшчыкаў мы выкінулі з нашай сям'і. Але ліцейны цэх дае нам 85 проц. нікуды нягодны штуцэраў, якія ў пераважнай большасьці ідуць на брак. Гэта зрывае работу кацельнага цэху. Мы патрабуем, таварышы ліцейшчыкі, каб вы зьнішчылі брак сваёй прадукцыі.

На жаль, ня ўсе цэхі пасьпадавалі бальшавіцкаму прыкладу кацельшчыкаў. Некаторыя цэхі ганебна адставалі ў выкананьні прамфінпляну. Напрыклад, арматурны цэх у сакавіку выканаў вытворчую праграму толькі на 55 проц.

У сувязі з XIII зьездам КП(б)Б і XVI зьездам УсеКП(б) на заводзе адчуваецца магутны пералом у разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і барацьбы за прамфінплян. Гэтымі днямі на заводзе адбылася вялікая рабочая канфэрэнцыя, якая падагуліла рэзультаты работы прадпрыемства. Канфэрэнцыя атала лепшых сапраўдных ударнікаў сацыялістычнага спаборніцтва і занесла на чорную дошку ілжэ-ўдарнікаў, выкрытых рабочай масай.

На канфэрэнцыі па ініцыятыве рабочых былі арганізаваны ўдарныя брыгады імя XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б). Рабочыя арматурнага цэху далі абавязацельства поўнасьцю ліквідаваць да партыйнага зьезду прарыў у выкананьні прамфінпляну.

Ударныя брыгады ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па выкананьні і перавыкананьні прамфінпляну да XVI зьезду УсеКП(б). Канфэрэнцыя выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва завод імя ЛАНЦУЦКАГА (Гомель) і завод «ЭНЭРГІЯ» (Менск) на лепшую падрыхтоўку да XV зьезду партыі.

В. Л.

„Спартак" дае слова

Выпусьціць звыш пляну 1000 тон паперы

XIII зьезду бальшавіцкай партыі ад рабочых і інжынэрна-тэхнічнага пэрсаналу фабрыкі «СПАРТАК» — ПРАЛЕТАРСКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ.

Прымаючы актыўны ўдзел у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне пяцігодкі, мы рапартуем XIII зьезду КП(б)Б аб рэзультатах нашай работы за першае паўгодзьдзе 1929-30 г.

У першым квартале «Спартак» выканаў вытворчую праграму на 98,73 проц., у другім квартале фабрыка поўнасьцю ліквідавала прарыў першага кварталу і перавыканала прамфінплян. Прамфінплян у другім квартале выкананы на 108,29 проц. За першае паўгодзьдзе «Спартак» выканаў вытворчую праграму на 103,33 проц.

Па якасных паказальніках прамфінплян на фабрыцы выкананы за першае паўгодзьдзе на 101,75 проц.

У параўнаньні з мінулым годам, прадукцыйнасьць працы павялічылася на 37,9 проц. Сабекошт прадукцыі зьніжаны на 7,6 проц.

Ліквідацыя прарываў першага кварталу праводзілася шляхам разгортваньня сацыялістычнага спаборніцтва і арганізацыі ўдарных брыгад. На прадпрыемстве праведзены важнейшыя рацыяналізатарскія мерапрыемствы, якія палепшылі работу напяровых машын.

На фабрыцы ёсьць 75 ударных брыгад, якія ахапляюць 300 рабочых і работніц. У адным з цэхаў працуе ўдарная вытворчая камуна.

«Спартак» абавязаўся перад цэнтральным камітэтам саюзу рабочых папяровай прамысловасьці выпусьціць звыш пляну 1.000 тон паперы. На сёньняшні дзень, за два месяцы, фабрыка выканала 67 проц. гэтага заданьня.

Змагаючыся за ліквідацыю прарываў і перавыкананьне прамфінпляну, мы адначасова прымалі ўдзел у калгасным будаўніцтве. На вёсцы працавалі 5 брыгад фабрыкі «Спартак» па правядзеньні калектывізацыі. Брыгады адрамантавалі каля 200 с.-г. машын. Сіламі рабочых брыгадзіраў ачышчана каля 10 тон насеньня. На пастаянай рабоце ў калгасах знаходзіцца 9 рабочых фабрыкі «Спартак». У сельсаветах працуюць 5 рабочых. У падшэфным сельсавеце на сродкі фабрычнага камітэту адкрыта хата-чытальня. Рабочыя фабрыкі ў добраахвотным парадку сабралі ў фонд калектывізацыі каля 1.400 руб.

Партыйная арганізацыя фабрыкі «Спартак» вырасла больш чым на 50 рабочых ад варштату.

***

Мы, рабочыя, служачыя, інжынэры і тэхнікі фабрыкі «Спартак» запэўняем XIII зьезд КП(б)Б, што да XVI зьезду партыі Леніна поўнасьцю ліквідуем усе недахопы, якія яшчэ ёсьць на нашай фабрыцы.

Мы абяцаем яшчэ больш разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва, яшчэ больш палепшыць якасьць прадукцыі, зьнізіць сабекошт, зьнішчыць прагулы.

Мы абяцаем даць краю ў тэрмін звыш пляну 1.000 тон паперы.

Няхай жыве XIII зьезд КП(б)Б—кіраўнік сацыялістычнага будаўніцтва!

ПАРТБЮРО ЗАВОДАКІРАЎНІЦТВА ФАБКОМ

Ф-ка «Спартак», Магілеўшчына.

Прэсы---цагельням

Абавязацельства рабочых заводу імя Сталіна

ЧЫГУНА - ЛІЦЕЙНЫ ЗАВОД ІМЯ СТАЛІНА, ФАБРЫКА ІМЯ ДЗЯРЖЫНСКАГА і БАБРУЙСКІ ДРЭВААПРАЦОЎЧЫ КАМБІНАТ УСТУШЛІ Ў САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ ПЕРАКЛІЧКУ НА ЛІКВІДАЦЫЮ ПРАРЫВАЎ ДА XVI ЗЬЕЗДУ УСЕ КП(б).

РАБОЧЫЯ ЗАВОДУ ІМЯ СТАЛІНА ДАЛІ СЛОВА ДА ПАРТЫЙНАГА ЗЬЕЗДУ:

— АРГАНІЗАВАЦЬ УДАРНУЮ БРЫГАДУ ТОКАРАЎ;

— ВЫПУСЬЦІЦЬ ДВА ПРЭСЫ ДЛЯ ЦАГЕЛЯНЬ.

— ВЫПУСЬЦІЦЬ 30 ТОН ЛІЦЬЦЯ.

***

РАБОЧЫЯ ФАБРЫКІ «ЧЫРВОНЫ ХАРЧАВІК», РАПАРТУЮЧЫ XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б АБ ПАСЬПЯХОВЫМ ХОДЗЕ БУДАЎНІЦТВА ФАБРЫКІ, АБЯЦАЮЦЬ:

— ДАЦЬ У ТЭРМІН 1.000 ТОН ПРАДУКЦЫІ І ВЫКАНАЦЬ ПОЎНАСЬЦЮ УСЕ ВЫТВОРЧЫЯ ПЛЯНЫ.

Капыльскі раен, Менскае акругі, першым ў БССР скончыў сяўбу

Саўгасы Мазыршчыны перавыканалі пасеўныя пляны

КАПЫЛЬ. (Наш кар.). Капыльскі раён скончыў сяўбу на 15 дзён раней тэрміну. Засеяна ўсяго 32.340 гэкт.: калгасамі—3.110 гэкт., індыв. сэктарамі—29.230 гэкт.

***

ПУХАВІЧЫ. (Наш. кар.). Рад калгасаў Пухавіцкага раёну скончыў сяўбу: камуна «Чырвоная Зорка», калгасы «Новае Жыцьцё», «Гарапашнік», «Новае Лясно», «Беларуская Вёска», «Іскра». Плян выкананы на 100 проц.

***

САМАХВАЛАВІЧЫ. Калгасы «Кастрычніцкая Рэвалюцыя» (Ратамка) і імя Карла Маркса гэтымі днямі скончылі веснавую сяўбу. Засеяна ўся плошча, вызначаная плянам.

***

СМАЛЯВІЧЫ. (Наш кар.). Скончылі сяўбу калгасы Смалявіцкага раёну: «Грамада», «Ленінскі Шлях» і «Чырвоны Кастрычнік».

***

МАЗЫР. (Наш кар.). На 25 мая саўгасы Мазырскай акругі скончылі сяўбу яравых, пашырыўшы леташнюю пасеўную плошчу прыблізна на 80 проц.

Засеяны ўсе адведныя землі, скарыстаны ўвесь насенны матар'ял за выключэньнем татуновага аўсу. Першымі сяўбу скончылі саўгасы «Ліпава», «Канстанцінава», «Лучысы» і «Дарагэвічы».

Зараз узорваецца пар і засяваюць віку звыш пляну ў саўгасах «Добрын» і «Какаровічы». Плян сяўбы гэтага году выкананы поўнасьцю.

***

МАГІЛЕЎ. (Па тэлефону ад наш. кар.). У газэту «Камунар» Магілеўшчыны штодзённа паведамляюць аб выкананьні і перавыкананьні пасеўных плянаў калгасамі.

З Шклоўскага раёна пішуць, што сяўбу скончылі 10 калгасаў. Засеяна 1.348 гэкт.

У Касьцюковіцкім раёне выкачалі пасеўны плян 11 калгасаў, якія пашырылі яравы клін на 12,6 проц. Засеяна 1.143 гэкт.

У Прапойскім раёне скончылі сяўбу 4 калгасы, у Клімавіцкім 4 калгасы.

Ударная праца калгасаў і пасьляховая сяўба ў гадзе калектывізаваў зьявіліся лепшай агітацыяй за калгас. Гэтымі днямі ў Магілеўскім раёне 4 бядняцка-серадняцкія індывідуальныя гаспадаркі, якія мяркуюць з калгасам, падалі заяву аб прыняцьці ў калектыў. Аб [illegible] ах панелямяюць і з іншых раёнаў.

ПАСТАНОВА САЎНАРКОМУ СССР

Аб дадатковых мерах да выкананьня пасеўных плянаў ільну і канапель

У мэтах выкананьня пасеўных плянаў ільну і канапель, Саўнарком СССР у дадатак да пастановы ад 23-га красавіка 1930 году, пастанаўляе:

Разьдзел I. У тых выпадках, калі сапраўды аказваецца немагчымым разьмеркаваць пасеўнае насеньне ільну і канапель сярод індывідуальных кантрактантаў на пачатках, прадугледжаных пастановай Саўнаркому СССР ад 23-га красавіка 1930 году, дазволіць Саўнаркомам саюзных рэспублік і прэзыдыумам абласных і краёвых выканкомаў пазычаць індывідуальным бядняцкім і серадняцкім кантрактантам насеньне ільну і канапель да збору.

Разьдзел II. Абавязаць Саюзкалгасбанк неадкладна даць распараджэньне сваім мясцовым органам, каб ад кантрактуючых арганізацый без перашкод прымаліся да вучоту абавязацельствы па пазыках насеньня ільну і канапель.

Разьдзел III. Абавязаць Саўнаркомы саюзных рэспублік, абласныя і краёвыя выканкомы ільнаводных і канапляводных раёнаў забясьпечыць такі парадак прасоўваньня насеньня ільну і канапель, каб ні адна гаспадарка, якая заключае дагавор аб кантрактацыі ільну і канапель і мае патрэбу ў насеньні, не засталася незабясьпечанаю.

Разьдзел IV. З прычыны ўзьнікшых на мясцох затрудненьняў з тлумачэньнем артыкулу 5-га пастановы ЦВК і Саўнаркому Саюзу ССР ад 23-га красавіка 1930 году аб дадатковых ільготах калгасам (збор законаў СССР 1930 году, № 24, арт. 261), вытлумачыць, што калгасы, атрымаўшыя насеньне ільну і канапель у пазыку, абавязаны іх вярнуць пасьля збору ўраджаю натурай, з разьлікам пуд за пуд аднолькавай чыстаты.

Стар. Саўнаркому Саюзу ССР— РЫКАЎ.

Нам. Кіраўніка справамі Саўнаркому Саюзу ССР і Савету Працы і Абароны— МІРОШНІКАЎ.

XIII зьезд КП(б)Б адкрываецца сёньня

ў памяшканьні „ДОМУ КУЛЬТУРЫ" ў 6 гадз. увеч.

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Даклад ЦК УсеКП(б)—дакладчык т. МАНУІЛЬСКІ.
2. Даклад ЦКК УсеКП(б)—дакл. т. ТРЫЛІСЕР.
3. Справаздача ЦК КП(б)Б:
   а) Палітычная—т. ГЕЙ;
   б) Арганізацыйная—т. ВАСІЛЕВІЧ.
4. Справаздача Цэнтральнай Рэвізыйнай Камісіі—т. КРОЛЬ.
5. Справаздача ЦКК-РСІ—т. КАЛНІН.
6. Выкананьне пяцігадовага пляну прамысловасьці—т. т. БЭНЭК, ГРЫСЕВІЧ.
7. Калгасны рух і ўздым сельскай гаспадаркі—т. т. ГАЛАДЗЕД і РАЧЫЦКІ.
8. Задачы прафсаюзаў у рэканструкцыйны пэрыяд—т. РЫЖОЎ.
9. Выбары цэнтральных устаноў партыі.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.

Напярэдадні XIII зьезду КП(б)Б

З 25-га мая ў Менск пачалі прыяжджаць дэлегацыі па XIII зьезд КП(б)Б з акруг.

Да вечара 29-га мая зьехалася звыш 100 дэлегатаў **Гомельскай, Мазырскай, Віцебскай, Бабруйскай, Аршанскай, Мекскай, Магілеўскай і Полацкай** партарганізацый.

Усе дэлегаты разьмешчаны ў будынку **АБВШ.**

***

Усіх дэлегатаў па зьезьдзе з рашаючым і дарадчым голасам будзе каля 500 чал.

***

29-га аргкамісіяй выдана звыш 600 госьцявых білетаў на адкрыцьцё зьезду.

Ад ЦКК-РСІ

30-га мая ў 18 г. у ЦКК-РСІ, Савецкая, 55, адбудзецца нарада па абгаварэньні вынікаў налёту на прадпрыемствы па праверцы давядзеньня прамфінпляну да варштатаў і рабочага.

На нараду павінны зьявіцца прадстаўнікі адміністрацыі, фабзаўкомаў і груп лёгкай кавалерыі абсьледаваных прадпрыемстваў, а таксама кансультанты па правядзеньні налёту.

Яўка абавязкова.

Сёньня, а 12 гадзіне дня адкрываецца пленум ЦК КП(б)Б у памяшканьні ЦК

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ

ДА XIII ЗЬЕЗДУ КП(б)Б

Правы апартунізм застаецца галоўнай небясьпекай

Даць руйнуючы адпор праваму апартунізму, які праяўляецца зачастую ў „новых“ формах, весьці непаслабную барацьбу з „левымі“ загібамі, якія льлюць ваду на млын правага апартунізму

Яшчэ лепш аўладаць самакрытыкай, як мэтадам штодзённай работы, і на аснове яе шырэйшага разгортваньня ўмацаваць адзінства радоў КП(б)Б, яшчэ лепш змагацца за няўхільнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі

За чыстату партыйнай лініі

Мы ўжо ня раз адзначалі факты бязумоўнага ажыцьлеўленьня апартуністычных элементаў унутры нашай партыі. Правыя і «левыя» апартуністыя аб'яднаны мі сіламі вядуць наступленьне супроць лініі нашай партыі, супроць партыйнага кіраўніцтва.

Зараз, калі мы падводзім вынікі пройдзенага з часу ад апошняга зьезду партыі перыяду, больш, чым калі-небудзь трэба падкрэсьліць, што толькі ў рашучай барацьбе супроць правага апартунізму і «левых» загібаў партыя дабілася буйных тэмпаў у галіне індустрыялізацыі, ажыцьцяўленьне дзьвюх выканаўняя пяцігодкі ў чатыры гады і забясьпечыла карэнны паварот да сацыялізму шырокіх мас бядняцка-серадняцкага сялянства.

Але таксама зусім відавочна, што труднасьці, якія сустракае партыя на шляху будаўніцтва, што труднасьці, якія ўзьніклі ў працэсе вастрэйшай гаспадарчай ломкі ў вёсцы за апошнія месяцы, абнаружылі клясавай барацьбы, узмацненьне супраціўленьня кулацтва справе сацыялістычнай рэканструкцыі вёскі, «хістаньні пэўнай часткі серадняка на грунце цапучаных памылак і т. д.»—усё гэта ўзмацніла спробы з боку апартуністычных элементаў заатакаваць на ўсёй лініі палітыку нашай партыі, усё гэта ажывіла надзеі правыя апартуністычных элементаў, спэкулюючых на труднасьцях нашай «вялікай эпохі».

Грубыя памылкі, якія былі дапушчаны рядам мясцовых партарганізацый ў галіне калгаснага руху, былі дўным парушэньнем кірункам, ясным і зусім правільнай лініі нашай партыі.

Зараз, калі правапартуністычныя элементы прабуюць прадставіць скажэньні гэтай правільнай лініі партыі, якія мелі месца ў радзе арганізацый, як лінію ўсёй партыі, як лінію яе ЦК, дык у гэтым са ўсёй выразнасьцю выступае жаданьне рэвізаваць генэральную лінію партыі.

Перагібы ў галіне калгаснага руху «маюць тэндэнцыю саштурхнуць нас са шляху ўзмацненьня саюзу з асноўнымі масамі сялянства, са шляху ўзмацненьня пралетарскай дыктатуры на шлях разрыву з гэтымі масамі, на шлях падрыву пралетарскай дыктатуры» (Сталін). Памылкі і скажэньні партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве былі яўным парушэньнем ленінскіх адносін да серадняка.

І імення няправільныя, антыленінскія адносіны да серадняка былі тэй асноўнай прычынай, якая стварыла частковы адліў з калгасаў, якая спрыяла ўзмацненьню істанькіх частак серадняцтва.

Але, дапушчаючы клясчасоваму ўмяшаньню ЦК УсеКП(б), партыя была мабілізавана на барацьбу з перагібамі. Дзякуючы дырэктывам ЦК і артыкулам т. Сталіна клясчасовасьць якіх адмаўляюць правыя і «левыя» апартуністыя, партыя вялося «павярнуць на правільны шлях людзей, якія ідуцца потыцьм да пропасьці».

Так, Сталін сказаў у сваіх «адказах калгаснікам» падкрэсьліў, што ЦК не замарудзіў ударыць па памылках са ўсёй сілай свайго аўтарытэту і што «наш ЦК таму і завецца Цэнтральным Камітэтам ленінскай партыі, што ўмее перамагаць і не такія труднасьці і ён перамог ужо гэтыя труднасьці ў асноўным».

Зусім відавочна, што той частковы адліў, які мы мелі з калгасаў, ніколькі не паслабляе такога агульнага палітычнага вываду, які быў ужо зроблены тав. Сталіным, вываду аб паваротце асноўных сялянскіх мас да сацыялізму, вываду аб узмацненьні саюзу рабочае клясы з серадняком.

І вось імення зараз, калі мы са ўсёй рэзкасьцю падкрэсьліваем гэтыя важнейшыя палітычныя вывады, імення зараз, зноў чуюцца галасы аб тым, што перагібы і памылкі, якія былі ў калгасным будаўніцтве, прывялі да парушэньня саюзу рабочае клясы з серадняком. Пужаць партыю разрывам з серадняком, парушэньнем саюзу з серадняком—гэта зброя з старага арсэналу правага апартунізму, якая выцягваецца зараз зноў з тым, каб рэвізаваць лінію партыі на калектывізацыю сельскае гаспадаркі, на ліквідацыю кулацтва, як клясы.

Гэтыя галасы, якія гавораць, што мы маем у пасобных мясцох размычку з серадняком, зьяўляюцца нічым іншым, як праваапартуністычнай папікай, як спробай абвінаваціць лінію партыі ў тых скажэньнях і памылках, якія былі на мясцох. Гэтае апартуністычнае панікёрства мае і яшчэ адзін сэнс—яно вядзе да абвінавачаньня кіраўніцтва партыі ў тым, што яно (кіраўніцтва), быццам, **несваячасова** ўдарыла па перагібах і тачу, быццам, прывяло да **парушэньня саюзу рабочае клясы з серадняком.**

«Левыя» загібшчыкі прабуюць мнімым недавер'ем сэрадняку да партыі вытлумачыць адліў з калгасаў і гэтым самым замазаць сваё памылкі і зьменшыць палітычнае значэньне іх анты-серадняцкіх перагібаў.

Мы ўжо гаварылі вышэй, што сьцьвярджэньне аб тым, што мы маем парушэньне саюзу з серадняком, фактычна вядзе да адмаўленьня таго вялікага і рашаючага пералому, якога партыя дабілася ў справе калектывізацыі. Тэзісы палітбюро да XVI зьезду УсеКП(б) аб калгасным будаўніцтве гаворыць: «Калі-б гэтыя памылкі ня былі своячасова выпраўлены Цэнтральным Камітэтам партыі...—гэта **пагражала-б** зрывам справы калектывізацыі сельскае гаспадаркі, **падрывам самой асновы** савецкай дзяржавы—саюзу рабочае клясы з сялянствам».

Але імення **своячасовым** дырэктывы ЦК папярэдзілі гэтую небясьпеку і толькі праваапартуністычныя можна характарызаваць тыя погляды, якія гавораць аб тым, што памылкі прывялі да парушэньня саюзу рабочае клясы з серадняком, да размычкі з серадняком.

Ясна, што той, хто заяўляе аб парушэньні саюзу з серадняком, той не разумее сутнасьці вялікага пералому, той не разумее і таго новага, што мы маем у адносінах да серадняка, які пайшоў у калгасы і які замацаваўся ў іх. Той, хто зараз крычыць аб размычцы з серадняком, той, бязумоўна, ніколі не зразумее, што перавод вёскі да калгасаў зьяўляецца **другім** і пры гэтым рашаючым крокам, які азначае важнейшы этап у справе пабудовы фундаманту сацыялістычнага грамадзтва СССР». Той, хто сьцьвярджае, што мы маем парушэньне саюзу рабочае клясы з серадняком, той нямнуна скоціцца да сьцьвярджэньня аб тым, што лінія нашай партыі, Цэнтральнага Камітэт—давялі да гэтага парушэньня.

Побач з гэтымі галасамі, галасамі аб «размычцы з серадняком», высоўваюцца і іншыя «тэорыйкі», якія дэзарыентуюць партыйныя масы.

Характэрнай рысай правага апартунізму зьяўлялася і зьяўляецца недаацэнка значэньня беднаты, як апоры рабочае клясы на вёсцы, недаацэнка важнасьці і значэньня работы партыі з беднатой. І часта, свае ўласнае нежаданьне працаваць з беднатой, або неразуменьне гэтага пытаньня прыкрываюць разважаньнямі аб тым, што беднака нельга арганізаваць, што бядняк—адсталы элемэнт і г. д., і г. д. І імення да гэтага могуць вясьці разважаньні аб тым, што аспэўная база, на якую апіралася цапша партыі, была ў заблытаным становішчы, што ў заблытаным становішчы яна знаходзіцца і зараз.

І тое, і другое вядзе да адмаўленьня таго бясспрэчнага факту, што наша партыя стаяла і стаіць на чале масавага руху за калектывізацыю, што наша партыя мела зусім правільную палітычную лінію ў кіраўніцтве гэтым рухам. Усе гэтыя погляды і «тэорыйкі» дапамагаюць тым, хто прабуе адлівы з калгасаў тлумачыць «няўхільнымі» хістаньнямі серадняка, або няправільнасьцю лініі нашай партыі.

Есьць таксама пасобныя галасы, якія сьхільны больш глядзець назад, чым наперад і якія часам адкрыта, а часам над прыкрыцьцем усякага маскаваньня, прабуюць паставіць пытаньне аб рэвізіі лёзунгу ліквідацыі кулацтва, як клясы, на аснове суцэльнай калектывізацыі. Як правільна адзначала «Правда», гэтыя элементы «з нагардай застаўляючы ў баку такія «драбніцы», як замацаваньне дасягнутых посьпехаў калгаснага будаўніцтва і далейшае яго разьвіцьцё, на базе гэтага замацаваньня», прабуюць «зноў аргумэнтаваць звычайнай для апартуністых спасылкай на «непадрыхтаванасьць» вёскі да масавай калектывізацыі, а партыі—да кіраўніцтва гэтым працэсам». Ясна, што ўсякая спроба ў тэй або іншай ступені рэвізаваць палітыку ліквідацыі кулацтва, як клясы, як непарыўную складаную частку суцэльнай калектывізацыі, што праводзіцца самымі бяднацкімі і серадняцкімі масамі, зьяўляецца спробай рэвізіі генэральнай лініі партыі. Зваротным бокам апартуністычнага мядлю зьяўляюцца заявы аб тым, што мы **ўжо ліквідавалі кулака.** Такія заявы вядуць да недаацэнкі кулацкай небясьпекі, да зьяўленьня пытаньня «хто-каго», да разбраеньня партыі і рабочае клясы ў нежорсткай барацьбе з клясавым ворагам у далейшым ажыцьцяўленьні палітыкі ліквідацыі кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі. «Палітыка ліквідацыі кулацтва, як клясы, навіна праводзіцца са ўсёй тэй настойлівасьцю і пасьлядоўнасьцю, на якую толькі здольны бальшавікі», так, гаворачы словамі т. Сталіна, стаіць пытаньне.

Усе гэтыя погляды, усе гэтыя тэорыі, якія зьяўляюцца частай апартуністычных кампэнцый і высоўваюцца ў процівагу ленінскай лініі нашай партыі, яшчэ раз сьцьвярджаюць неабходнасьць узмацненьня барацьбы супроць правага апартунізму, як галоўнай небясьпекі на шляху ўзяцця сацыялістычнай рэканструкцыі і супроць «левых» загібаў, якія пацэнь з сабою пагрозу зрыву саюзу з серадняком, якія жывяць правы ўхіл і ўзмацняюць яго пазыцыі.

І было-б наіўнасьцю ставіць пытаньне такім чынам, што быццам-бы, праваапартуністычныя элементы будуць толькі імкнуцца атакаваць лінію партыі. Факты такіх атак мы бачылі раней, мы бачым іх і зараз, яны сьведчаць аб ажыўленьні праваапартуністычных элементаў і партыя павінна ўзмацняць сваю чуйнасьць у барацьбе супроць гэтых атак, партыя дае і будзе даваць рашучы адпор спробам рэвізіі партыйнай лініі, адпор усялякім праваапартуністычным поглядам і «тэорыйкам». І імення зараз патрэбна са ўсёй выразнасьцю падкрэсьліваць яшчэ і яшчэ раз неабходнасьць самай вострай барацьбы па два фронты, неабходнасьць мабілізацыі партыі для гэтай барацьбы, а не адкладваць гэтую мабілізацыю на якуюсьці нявызначаную будучыню, на якісьці асобны патрэбны момант.

Усякая недаацэнка правай небясьпекі, як галоўнай, і «левых» загібаў, усякае прымірэньцтва да апартуністычных тэорый і разважаньняў, усякае іх палітычнае замазваньне павінна патэнцыяваць на сьцяну бальшавіцкай непрымірымасьці і бальшавіцкай прынцыповасьці. І, зразумела, што ў гэтую барацьбу мы будзем укладваць, як гэта гаворыць ЦО нашай партыі—«Правда», «усю сваю непрымірымасьць, усю сваю ўпэўненасьць у перамогу сацыялізму ў нашым краі, усю палкасьць баявога авангарду пралетарскіх мас». І, зразумела, што гэтую барацьбу бальшавікі ніколі не вялі і ня будуць весьці па рэцэптах некаторых гора-фальсэтоністых, сюсюкалучых мінчан, якія прабуюць тлумачыць скрыўленьні і памылкі ў партыйнай лініі тым, што ўсе мы «чалавекі», і нам, як «чалавекам», нішто чалавечае ня чужое.

Адной з галоўных умоў нашага пасьпяховага кіраўніцтва будаўніцтвам сацыялізму ў СССР зьяўляецца тая рашучая і вострая барацьба, якую вяла, вядзе і будзе весьці наша партыя над ленінскім кіраўніцтвам свайго Цэнтральнага Камітэту на два фронты—з правымі і «левымі» ўхілістымі, супроць усялякіх атак на лінію партыі, супроць усялякіх «новых» апартуністычных «тэорый»—за бальшавіцкую чыстату палітычнай лініі.

КП(б)Б у барацьбе за пралетарскую самакрытыку

Адной з важнейшых задач праходзячых партыйных канфэрэнцый і надыходзячага XIII зьезду КП(б)Б зьяўляецца праверка ўсёй праведзенай работы па разгортваньні пралетарскай самакрытыкі, як магутнага сродку для вырашэньня асноўных задач рэканструкцыйнага пэрыяду, як лепшае зброі ў руках партыі для ўзмацненьня бальшавіцкага адзінства камуністычных радоў. Задача зьезду заключаецца ў тым, каб па-бальшавіцку і да канца выкрыць усе недахопы, памылкі і скрыўленьні партыйнай лініі, расчысьціць шлях для далейшага, яшчэ больш рашучага і глыбокага разгортваньня пралетарскай самакрытыкі.

Ва ўмовах Савецкай Беларусі з яе
Ва ўмовах Савецкай Беларусі, з яе гістарычна-адсталай эканомікай, выраўнаньне асноўных задач сацыялістычнае рэканструкцыі народнае гаспадаркі патрабуе выключных намаганьняў і напружаньня ўсіх сіл партыі і пралетарыяту. Асноўныя вынікі разьвіцьця народнае гаспадаркі БССР за пройдзены пэрыяд сьведчаць аб тым, што КП(б)Б з поспехам спраўляецца з стаячымі перад ёю задачамі, што Савецкая Беларусь хутка крочыць уперад па шляху капэнтай сацыялістычнай рэканструкцыі сваёй, раней адсталай, гаспадаркі. Зусім ясна, што вялізарныя посьпехі на ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва, насьпіховае выкананьне і перавыкананьне пяцігодкі, вялізарны рост вытворчае базы і рабочае клясы і разьвіцьцё прадукцыйных сіл у сельскай гаспадарцы, а таксама буйныя дасягненьні ў галіне культурнага будаўніцтва былі-б немагчымы без рашучага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, без сьмелага разгортваньня пралетарскай самакрытыкі, без рашучай барацьбы з усім тым, што перашкаджала і тармазіла разгортваньне самакрытыкі. Цьвёрда і пасьлядоўна правадзімая КП(б)Б лінія на разьвіцьцё крытыкі і самакрытыкі забясьпечыла мабілізацыю шырокіх пралетарскіх мас наўкола задач сацыялістычнага будаўніцтва, узьняла магутную хвалю творчай пралетарскай актыўнасьці, узмацніла волю партыі і пралетарыяту да перамогі трудносьцяй і да барацьбы за перамогу сацыялізму. Пралетарская пераклічка паміж фабрыкамі і заводамі, магутная хваля сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва, якая ахапіла ўсе прадпрыемствы Беларусі і пераважную частку рабочае клясы, адкрылі новыя невычарпальныя крыніцы сіл і магчымасьцяй для вырашэньня задач сацыялістычнай рэканструкцыі. У асноўве гэтага вялізарнейшага ўздыму пралетарскай актыўнасьці ляжыць ленінская палітыка, якая пацьвердла і ажыцьцёўна праводзіцца партыяй, непахісная лінія на разгортваньне самакрытыкі, «ня гледзячы на асобы».

Разьвіцьцё пралетарскай самакрытыкі зьяўляецца магутным сродкам барацьбы за палепшэньне дзяржапарату, барацьбы з недахопамі, бюракратызмам і скажэньнем клясавай лініі з боку апонэнта. Значнае ўзмацненьне і разьвіцьцё новых форм рабочага кантролю над савецкім апаратам (рабочыя брыгады, рабочае пэфэстка над дзяржапаратам, лёгкая кавалерыя, вылучэньне тысяч і дзесяткаў тысяч лепшых рабочых і работніц у сваапарат, вялізнае ўзмацненьне ролі друку ў справе барацьбы з недахопамі сваапарату) уся гэта вялізарная работа ўжо дала вялікія станоўчыя вынікі па аздараўленьні і ўзмацненьні сваапарату. Бязьлітасная барацьба, якая праводзілася і праводзіцца КП(б)Б з ухіламі ад ленінскай лініі нашай партыі, цьвёрды курс на разгортваньне пралетарскай самакрытыкі мелі рашаючае значэньне ў справе выкрыцьця шматлікіх недахопаў і скажэньняў палітычнай лініі радам важнейшых савецкіх органаў і каапэрацыйных арганізацый. Клясавыя скажэньні і праваапартуністычная лінія зямельных органаў Беларусі, у галіне культурнай работы, апартуністычныя скажэньні ў рабоце саматужна - прамысловай каапэрацыі і некаторых іншых арганізацыях былі выкрыты ва ўсёй паўнаце толькі тады, калі КП(б)Б сапраўды ўдалося разгарнуць бальшавіцкую самакрытыку, мабілізаваць партыйныя масы на рашучую барацьбу з праваапартуністычнымі тэорыямі і практыкай, калі сапраўды паднята была ярасьць мас супроць скажэньняў клясавай лініі з боку раду савецкіх органаў і арганізацый. Пастановы верасьнёўскага пленуму КП(б)Б у 1929 г. па ўсіх пытаньнях, абгаваротых пленумам, завастраюць увагу ўсёй партарганізацыі на важнейшай задачы на стварэньні ўсіх неабходных умоў для выгорнага разгортваньня самакрытыкі, на забесьпячэньні самых уважлівых і чулых адносін да крытыкі мас з боку ўсіх партарганізацый. Адозва верасьнёўскага пленуму на пытаньні аб самакрытыцы заклікае ўсю партарганізацыю да бязьлітаснай барацьбы з усімі гнуцелямі самакрытыкі, да рашучага выкрыцьця ўсіх элементаў у радох нашай партыі і ў дзяржанараце, якія тармозяць разьвіцьцё самакрытыкі, патрабуе ад усёй партарганізацыі прыняцьця ўсіх мер для сьмелага і рашучага разгортваньня самакрытыкі, ня гледзячы на асобы, ставячы гэта, як адну з важнейшых баявых задач перад усёй КП(б)Б.

Зусім выключная роля і значэньне пралетарскай самакрытыкі ў галіне барацьбы з памылкамі і скрыўленьнямі партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве. Пастановы ЦК ад 17-га красавіка 1930 году, пастановы раду партыйных камітэтаў, якія па-бальшавіцку выкрываюць дапушчаныя ў калгасным будаўніцтве памылкі, шырокая хваля самакрытыкі, накіраваная ў бок найбольш глыбокага выяўленьня ўсіх памылак і скрыўленьняў партыйнай лініі з боку раду камуністых і асобных партарганізацый у калгасным будаўніцтве, забясьпечыла рашучы паварот і пераключэньне ўвагі з боку ўсёй партарганізацыі на ліквідацыю гэтых памылак, на рашучае зьнішчэньне анты-серадняцкіх перагібаў, на непрымірымую барацьбу з праваапартуністычнымі скрыўленьнямі і «левымі» загібшчыкамі. Дзякуючы гэтаму ўдалося замацаваць дасягнутыя рэзультаты ў галіне калектывізацыі сельскае гаспадаркі і забясьпечыць далейшы рост і разьвіцьцё калгаснага будаўніцтва.

Ва ўмовах КП(б)Б, якая ажыцьцяўляе кіраўніцтва сацыялістычным будаўніцтвам у нацыянальнай рэспубліцы, пралетарская самакрытыка адыгрывае вялізарную ролю ў справе барацьбы за правядзеньне правільнай ленінскай нацыянальнай палітыкі. Посьпехі, дасягнутыя КП(б)Б у галіне нацыянальнага і культурнага будаўніцтва, у барацьбе з ухіламі ад ленінскай лініі ў нацыятаньні — з беларускім нацыянал-дэмакратызмам і нацыянал-апартунізмам у радох КП(б)Б, з рознымі шавінізмамі, былі магчымы, дзякуючы цьвёрдай і непрымірымай лініі КП(б)Б у нацыятаньні, шырокай мабілізацыі партыйных мас і ўсёй пралетарскай грамадзкасьці вакол выраўнаньня асноўных задач нацыянальнай палітыкі і пакіраваньня агню самакрытыкі на барацьбу з ухіламі з рознымі хістаньнямі ў нацпалітыцы.

Усе посьпехі, якія мы маем у разгортваньні пралетарскай самакрытыкі, дасягнуты партыяй у рэзультаце рашучай барацьбы з апартуністычнымі элементамі ў радох КП(б)Б, якія тармазілі і зараз яшчэ тармозяць справу разгортваньня самакрытыкі. КП(б)Б правяла вялікую работу па перамаганьні меўных месца настрояў у радзе нашых партарганізацый, якія разглядалі самакрытыку, як адну з чарговых кампаній. Патрэбны былі немалыя намаганьні для таго, каб дабіцца ўсьведамленьня таго, што самакрытыка не зьяўляецца кампаніяй, а мэтадам усёй нашай работы, магутным вагаром па ўцягненьні мас у сацбудаўніцтва, пасьпяховага вырашэньня задач сацыялістычнай рэканструкцыі і бальшавіцкага згуртаваньня партыйных радоў.

Ці можам мы сьцьвярджаць, што КП(б)Б ужо зроблена ўсё для разгортваньня самакрытыкі? Не, яшчэ далёка ня ўсё. Аб гэтым гаворыць цэлы рад прарываў і скажэньняў партыйнай лініі ў справе правядзеньня самакрытыкі, якія выяўлены за мінулы год. Трэба проста сказаць, што калі-б самакрытыка была разгорнута паўнай і глыбей, калі-б была дасягнута большая дзейснасьць самакрытыкі, мы-б мелі бясспрэчна яшчэ больш буйныя посьпехі ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Уважлівае вывучэньне раду партарганізацый КП(б)Б ужо пасьля верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б 1929 году (Залінейнага раёну Гомельскай арганізацыі, Полацкай партарганізацыі, 2-га раёну г. Віцебску, парткалектыву фабрыкі «Бярэзіна» ў Барысаве і раду іншых) паказала, што самакрытыка далёка яшчэ ня стала мэтадам работы, сродкам у руках партыйных арганізацый для барацьбы з розпага роду недахопамі партыйнага, прафсаюзнага і гаспадарчага кіраўніцтва, сродкам мабілізацыі мас на выкананьне прамфінпляну. Устаноўдена, што амаль па ўсіх гэтых арганізацыях гаспадарчыя прарывы, невыкананьне прамфінпляну, слабасьць масавай і партыйнай работы, слабасьць прафсаюзнай работы ўніраюцца ў пытаньне зусім невыстарчальнага разьвіцьця самакрытыкі, а часамі і простага заціску яе. Асабку самакрытыкі, няправільнага кіраўніцтва і апартуністычных скажэньняў лініі партыі ў самакрытыцы, якія выяўлены былі ў Гомельскай партыйнай арганізацыі. Гэты матар'ял ужо асьвятляўся на старонках «Правды». Недахвату ў добрых рэзалюцыях там ня было па частцы самакрытыкі, а на справе мелі месца абураючыя факты заціску самакрытыкі, ганеньняў і праследаваньняў рабкораў па радзе прадпрыемстваў, абвінавачаньня выступаўшых з крытыкай партыйцаў у «левых» заскоках, інсцэнірووцы судовага працэсу над рабкорам Мяжэньнікавым і Маркавым. Паміж словамі і справай атрымаўся яўны разрыў. Ранейшае парткіраўніцтва ня толькі не разгледзела ўсёй палітычнай сутнасьці ўсіх гэтых яскравых фактаў заціску самакрытыкі, але і само зышло з правільнай лініі партыі ў пытаньні самакрытыкі. Таму Цэнтральны Камітэт КП(б)Б сурова асудзіў лінію Гомельскага парткіраўніцтва, ацаніў гэтыя дзеяньні акругкому і АКК як апартуністычнае скажэньне лініі партыі ў пытаньні самакрытыкі і правёў рад арганізацыйных мерапрыемстваў. Гомельскі урок, такім чынам, вучыць усе партарганізацыю, што справа ня толькі ў добрых рэзалюцыях, а ў сапраўднай непрымірымай барацьбе з усякімі глушыцелямі самакрытыкі ў забясьпячэньні на справе ўсіх патрэбных умоў для разгортваньня самакрытыкі зьнізу, ня гледзячы на асобы.

Яшчэ да гэтага часу ў розных арганізацыях маюць месца спробы з боку асобных камуністых, кіруючых гаспадарчых, прафсаюзных і партыйных работнікаў да абмежаваньня самакрытыкі, імкненьне ўвагнаць яе ў яўныя рамкі. Праводзячы рашучую барацьбу з усякімі спробамі скарыстаць самакрытыку ў мэтах барацьбы супроць генэральнай лініі партыі, у мэтах парушэньня ленінскага адзінства, партыя разам з тым праводзіць ня менш рашучую барацьбу з тымі, якія імкнуцца рэгляментаваць і абмяжоўваць самакрытыку.

Найбольшай увагі заслугоўвае другая небясьпека, якая назіраецца ў радзе выпадкаў. Яна заключаецца ў насыўным супраціўленьні з боку некаторых небальшавіцкіх элементаў разгортваньню пралетарскай самакрытыкі. Пасьля таго, калі партыя рашуча ўдарыла па элементах, што адкрыта выступалі супроць самакрытыкі, гэтыя апартуністычныя элементы сваю ранейшую палітыку простага супраціўленьня перамянілі на палітыку ціхага «сабатажу» самакрытыкі. Гэта праяўляецца ў форме ігнараваньня самакрытыкі, адмоўваньня на крытыку мас, не даюць адказу на крытыку рабочых у друку, на сходах і гэтак далей. Праведзеная пядаўна сэктарам друку Культпропу ЦК КП(б)Б праверка выявіла, што вялізная колькасьць, а па некаторых газэтах пераважная частка крытычных заметак застаецца без адказу і рэагаваньня. Гэта новая форма барацьбы супроць самакрытыкі — самая горшая і шкодная, бо далёка лягчэй знайсьці і выцягнуць на «сонейка» адкрытага зажымшчыка самакрытыкі, чымся ціхага сабатажніка. Таму барацьба з гэтай новай формай глушэньня пралетарскай самакрытыкі павінна праводзіцца яшчэ з большай сілай. Зусім не выпадкова, што на сходах партыйных і рабочых часта чутны справядлівыя скаргі і нараканьні на тое, што не рэагуюць на самакрытыку, нават не адказваюць, што крытыка рабочых часта вядзецца ўпустую. Ня трудна ўдавіць, што асноўнай прычынай такіх настрояў зьяўляецца гэта новая форма супраціўленьня самакрытыцы з боку бюракратычных і небальшавіцкіх элементаў у радох нашай партыі, прытуленьня чуласьці і ўвагі да крытыкі пралетарскіх мас, слабое рэагаваньне і фармальны падыход да самакрытыкі з боку некаторых арганізацый і асобных камуністых.

Неабходна праводзіць рашучую барацьбу з фармальнымі адносінамі да самакрытыкі. Сказаць некалькі слоў аб сваіх недахопах «у парадку самакрытыкі» гэта яшчэ не азначае, што самакрытыка разгорнута. Сапраўдная самакрытыка заключаецца ў тым, каб ня толькі гаварыць аб недахопах, але ў правядзеньні сапраўдных мер па зжываньні недахопаў, сапраўдных мер па барацьбе са скрыўленьнямі палітычнай лініі, уважлівым уліку крытыкі мас, сапраўднай, а не папяровай, барацьбы з элементамі, якія заціскаюць і тармозяць самакрытыку, у якой-бы форме гэта не праяўлялася.

Адной з важных баявых задач, што стаяць перад усёй КП(б)Б, зьяўляецца задача забясьпечыць на ўсіх арганізацыях КП(б)Б, па ўсіх прафсаюзных, на ўсіх гаспадарчых арганізацыях, на ўсіх галінах сваёй работы, усе неабходныя ўмовы для сьмелай і рашучай самакрытыкі, ня гледзячы на асобы, узьняць новую хвалю пралетарскай самакрытыкі зьнізу, яшчэ вастрэй адтачыць гэту мацнейшую зброю ў руках партыі, у мэтах яшчэ большага ўмацаваньня адзінства камуністычных радоў, яшчэ большага навышэньня кляпэньня з посьпехам задач сацыялістычнага будаўніцтва.

В. ГАНТМАН.

Праверыць, як выкарыстоўваюцца „25-тысячнікі“

Лісты рабочых, пасланых у калгасы, сыгналізуюць аб:

няправільным іх выкарыстоўваньні ў радзе месц; слабой дапамозе з боку мясцовых арганізацый; адсутнасьці сувязі з прадпрыемствамі і прафсаюзамі; дрэнным матар'яльным забесьпячэньні.

Ганебныя адносіны

У Лепельскім раёне, Полацкай акругі, працуе 4 дваццаціпяцітысячнікі. Яны жывуць у всіх немагчымых умовах.

Памяшканьне работы гуты «Труды» т. Андрэева, які працуе старшынёй калгасу «Авангард» у Лісьнянскім сельсавеце. Ён знаходзіцца там ужо 3 з палавой месяцы і за ўвесь час зарплаты ад свайго заводу не атрымліваў. Тав. Андрэеў жыў на аванс у 130 руб., які яму выдаў райкалгассаюз. Рабочы-кальгаснік ня раз зварачаўся да заводакіраўніцтва з просьбай выслаць яму грошы, але адказу да гэтага часу не атрымаў. Заўсёды ня цікавіцца ні жыцьцём, ні працай т. Андрэева.

Не дапамагае рабочаму і райкалгассаюз. Тав. Андрэеву вызначана стаўка ў калгасе — 18 руб. у месяц, але і гэтых грошай яму не выдаюць. Адзінае, што ён атрымлівае — гэта 12 кілёграм мукі ў месяц і 1 літар малака ў дзень. Вось усё, чым ён харчуецца. З тэй прычыны, што двоў для аналу няма, яму самому прыходзіцца зьбіраць сучо.

Ня лепшы малюнак умоў працы і ў рабочага сормаўца т. Урыкава, які зараз працуе старшынёй кусту калгасаў Каменьскага сельсавету. Пачынаючы з 1 лютага, ён не атрымліваў зарплаты. Пісаў аб гэтым у заводакіраўніцтва, у заўком, у партячэйку, але яго лісты засталіся безадказнымі. Толькі пасьля таго, як з Урыкавым пачалі пісаць у «Нижегородскую Коммуну», ён атрымаў ліст ад лідцэнта пошты № 18 сормаўскага заводу. У ім, між іншым, пішацца: «Вы, т. Урыкаў, крыху горача паступілі, напісаўшы ў газэту. Грошы вам выслалі яшчэ ў красавіку».

Гэтыя грошы яшчэ і сёньня не атрыманы.

Тав. Антанавіч таксама рабочы-сормавец. Працуе старшынёю кусту калгасаў Лепельскага сельсавету з 1 лютага. За ўвесь час ён атрымаў ад заводу 100 руб. зарплаты. Заводакіраўніцтва, між іншым, паведаміла яму, што будзе высылаць яму 50 проц. зарплаты і што ён павінен кожны раз высылаць спраўку аб тым, што ён працуе ў калгасе.

Прыблізна ў такіх-жа ўмовах знаходзіцца рабочы-сормавец т. Бялевіч, які працуе старшынёю кусту калгасаў у Пыцінскім сельсавеце.

Мясцовыя арганізацыі ня цікавяцца ўмовамі жыцьця рабочых-калгаснікаў. Трэба, урэшце, спыніць такія ганебныя адносіны да рабочых-калгаснікаў добра ўгледзець кіраўнікоў.

О.

Паслалі і забылі

(Ад нашага аршанскага карэспандэнта)

Рабочыя Аршаншчыны накіравалі на пастаянную работу ў калгасы каля 100 чал. Але многія райкалгассаюзы і райнаўводсаюзы абмежаваліся толькі тым, што разьмеркавалі 25-тысячнікаў па калгасах і на гэтым лічаць сваю работу скончанай.

25-тысячнікі ў сваіх лістох скардзяцца на тое, што **мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі не аказваюць ім дапамогі ў іх рабоце. Яшчэ дагэтуль акрпалгассаюз і прадпрыемствы не надазілі сувязі з рабочымі. На лісты апошніх у большасьці выпадкаў ніхто не адказвае.**

Вось прыклады таго, як некаторыя арганізацыі выконваюць дырэктывы партыі і вышэйшых прафсыянальных органаў аб забесьпячэньні парнальных умоў для работы 25-тысячнікаў.

Тав. Раскін, старшыня праўленьня калгасу «Чырвоны Кастрычнік», дагэтуль ня мае кватэры і яму прыходзіцца кожны раз шукаць начлег у новым месцы. Акркалгассаюз аб гэтым ведае, але практычнай дапамогі пакуль што не аказвае.

Фабрыка «Дняпроўская Мануфактура» плаціць свайму рабочаму-добраахвотніку, які працуе ў калгасе «Ларынаўка» пэнсію бяз уліку прыробтку ў той час, як гэта прыработак павінен улічвацца.

25-тысячнік Глінскі, які працуе ў адным з калгасаў Дубровенскага раёну, з лютага месяца не атрымліваў пэнсіі ад прадпрыемства. Калгас яму таксама не плаціў. Калі т. Глінскі паехаў у Менск, каб там урэгуляваць пытаньне з пэнсіяй, райвыканком палічыў яго дэзэртырам, зьняў з працы і прызначыў іншага старшыню калгасу.

Рабочы Санковіч зьявіўся ў Дрыбінскі райвыканком, каб дагаварыцца аб сваёй далейшай працы, бо буйнае калгаснае аб'яднаньне, дзе ён раней працаваў, распалася. Замест таго, каб выкарыстаць т. Санковіча на рабоце ў іншым калгасе, райвыканком проста параіў 25-тысячніку зьяшчэ з вучоту і паехаць у акркалгассаюз.

Вось у якім становішчы прыходзіцца працаваць многім 25-тысячнікам на Аршаншчыне.

А. М.

Адзначаючы, што партарганізацыі ўдзяляюць працы „25-тысячнікаў“ вельмі слабую ўвагу, абавязаць акругкомы і райкомы дасканала азнаёміцца з абстаноўкай працы кожнага „25-тысячніка“, прыняўшы меры да стварэньня неабходных умоў для іх замацаваньня на працы. (З пастановы ЦК УсеКП(б) ад 21-га мая 1930 г.).

Рабочыя хлебазаводу, дзе-ж вашы абяцаньні?

— Калі мяне пасылалі на работу ў вёску,—піша з Бягомльскага раёну, Менскае акругі, т. Сухараў, **парткалектыў і рабочыя менскага хлебазаводу абяцалі падтрымліваць са мною цесную сувязь.** На справе-ж атрымалася інакш. **Я паслаў на завод некалькі лістоў, а адказу не атрымаў.** Ніхто нічога ня піша.

Спачатку мяне накіравалі на работу ў куставое аб'яднаньне калгасаў Бярэзіна-Ліпск. Не пасьпеў я навет належным чынам азнаёміцца з калгасамі, як мяне перакінулі ўжо ў іншы раён. У новым калгасным аб'яднаньні няма ні агранома, ні рахункавода і прыходзіцца працаваць у вельмі цяжкіх умовах, бо наўсталюць у практычнай працы рад пытаньняў, якіх я сам вырашыць не магу. Бюро райкому зварачае мала ўвагі на работу 25-тысячнікаў. **Да гэтага часу 25-тысячнікі ні разу на склікаліся, ім не далі ўстаноўкі ў рабоце.**

Цяпер пару слоў наконт работы ў калгасах. На кусьце ўжо засеяна каля 70 проц. усёй плошчы. Работа ідзе ўдарным тэмпам. Адзін калгас дапамагаў другому. Настрой калгаснікаў добры. Насенным, інвэнтаром і цягавай сілай калгасы забясьпечаны.

Галоўную ўвагу зараз зварачаем на масавую работу сярод калгаснікаў і на ўцягненьне новых сялян-індывідуальнікаў, беднякоў і сераднякоў, замацаваньне існуючых калгасаў і арганізацыю працы.

Зварачаюся да рабочых хлебазаводу з просьбай напісаць аб тым, як ідзе работа, ці зьнішчаюцца прагулы і як выконваюцца прамфінплян?

Чакаем адказу

Фабрыка «Чырвоная Бярэзіна» ў Барысаве накіравала на работу ў вёску тав. Краўчанку, якая была выбрана старшынё

Дзяржплян БССР рапартуе XIII зьезду КП(б)Б

Плян вялікіх работ выконваецца з перавышэньнем

Лезунг рабочай клясы—„пяцігодку за чатыры гады"—праводзіцца у жыцьце

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі працоўныя БССР дасягнуць новых вялізарных посьпехаў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва

Прэзыдыум Дзяржпляну БССР рапартуе XIII зьезду КП(б)Б аб ходзе і пэрспэктывах выкананьня пяцігодкі.

Грунтуючыся на аналізе вынікаў выкананьня пяцігадовага пляну, прэзыдыум Дзяржпляну БССР, як гэта відаць з публікуемых даных, прыходзіць да выводу, што праграма пяцігадовага пляну, накіраваная на сацыялістычную перабудову народнай гаспадаркі БССР, выконваецца з перавышэньнем. Гэта зьяўляецца пераканаўчым доказам правільнасьці генэральнай лініі камуністычнай партыі і яе штабу—ЦК УсеКП(б). У барацьбе з правым ухілам, які ў сучасны момант зьяўляецца галоўнай небясьпекай, і «левымі» загібамі—рабочая кляса БССР, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, дасягнула вялізарных посьпехаў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва.

Прэзыдыум Дзяржпляну БССР упэўнены, што далейшы ход разгортваньня пяцігадовага пляну прынясе яшчэ больш значныя посьпехі ў справе сацыялістычнай перабудовы гаспадаркі БССР.

Старшыня Дзяржпляну БССР
С. Л. ГОЛЬДБЭРГ.

Пэрспэктыўная карта электрыфікацыі БССР



Гэта карта, складзеная на падставе новай пяцігодкі электрыфікацыі, паказвае сетку электрастанцый БССР да канца пяцігодкі.

ТРЫ ЗОРАЧКІ паказваюць РАЁННЫЯ электрастанцыі (Асінаўскую, Гомельскую і Прапойскую). З іх першая пачынае функцыянаваць у канцы бягучага гаспадарчага году. Апошнія дзьве павінны быць пушчаны ў эксплёатацыю да канца бягучай пяцігодкі. Магутнасьць гэтых станцый, паводле апошняга праектаваньня Дзяржпляну, намячаецца ў наступных разьмерах: Асінаўская—60.000 кілёват, Гомельская—48.000 кілёват і Прапойская—96.000 кілёват. Да канца пяцігодкі Асінаўская станцыя будзе даваць 36.000 кілёват, а Гомельская і Прапойская—па 24.000 кілёват.

Лінія (паказаная на карце кропкамі) прадстаўляе сабою ВЫСОКАВОЛЬТНУЮ ЛІНІЮ ПЕРАДАЧЫ. [illegible] гэтыя станцыі паміж сабою [illegible] ваецца да бліжэйшых цэнтр[illegible]

БУЙНЫМІ КВАДРАЦІКАМІ на карце станцыі ПРАМ[illegible] ТЫПУ, магутнасьцю ад 6 [illegible] кілёват. Гэты тып станцый [illegible] маць другое месца пасьля [illegible] пагільне сабою да канца пяцігодкі большасьць станцый МЯСЦОВАГА значэньня.

Рад гэтых станцый, як Віцебская, Аршанская, Магілеўская і Крычаўская мяркуецца аб'яднаць у адзіную сетку з раённымі станцыямі і ўключыць іх у адзіную энэргетычную гаспадарку ўсходняй часткі БССР.

ТРЫКУТНІКАМІ паказаны на карце станцыі ДРУГАРАДНАГА ЗНАЧЭНЬНЯ, [illegible] пяцігодкі будуць [illegible] [illegible] будуць абслугоўваць [illegible] патрэбы СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ. Магутнасьць гэтых станцый будзе складаць ад 1.000 да 6.000 кілёват. Некаторыя з іх, як у Слуцку, Загальлі і іншых мясцох, набываюць характар буйных станцый і абслугоўваюць электраэнэргіяй свае раёны.

Прамысловасьць апярэджвае намячэньні пяцігодкі

Мінулы пэрыяд пяцігодкі паказвае надзвычай буйны рост прамысловасьці. Тэмп росту валавой прадукцыі ўсёй дзяржаўнай буйнай прамысловасьці на 1927-28 год вызначыўся ў 33,3 проц., за 1928-29 г. — у 44,4 проц. На 1929-30 год плянам вызначан рост у 65,2 проц. Згодна прамфінпляну 1929-30 году, дынаміка разгортваньня прамысловасьці, падпарадкаванай ВСНГБ, перавышае намячэньні пяцігодкі наступным чынам: паводле пяцігодкі рост прадукцыі ў 1929-30 годзе ў адносінах да 1927-28 году быў вызначан у 187,2 проц., а прамфінплян 1929-30 году паказвае рост у 267,7 проц. (у тым ліку па групе «А» адпаведна—144,8 проц. і 222,7 проц., па групе «Б»—215 проц. і 297,3 проц.)

Рэспубліканская прамысловасьць значна апярэджвае намячэньні пяцігодкі, выконваючы ўжо ў другім годзе пяцігодкі па колькасьці прадукцыі амаль поўнасьцю заданьне трэцяга году пяцігодкі.

Выраб паперы за два гады павялічваецца на 91 проц. супроць намечанага росту за два гады, паводле пяцігодкі, на 31,6 проц., выраб кардону дае рост на 62 проц. супроць 21 проц. паводле пяцігодкі. Выпуск сячкарань павялічваецца з 6.200 штук у 1927-28 г. да 15.000 шт. у бягучым годзе, або на 142 проц., у той час, як пяцігодкай прадугледжваецца рост толькі на 34 проц. Выраб абутку ўзрастае з 295.000 шт. да 2.367 тыс. штук, г. зн. больш, чым у 8 раз супроць росту ў два з лішкам разы паводле пяцігодкі. Такое значнае перавышэньне заданьняў пяцігодкі па выпуску прадукцыі нашай прамысловасьці зьявілася вынікам больш эфэктыўнага скарыстаньня асноўнага капіталу, у сувязі з ростам зьменнасьці, пераходам на бесьперапынны рабочы тыдзень, разьвіцьцём сацыялістычных форм арганізацыі працы (сацпаборніцтва, ударніцтва), а таксама пашырэньня тэхнічнай базы прамысловасьці. Рост капітальных укладаньняў у прамысловасьць ідзе побач з сыстэматычным павялічэньнем долі новага будаўніцтва, што характарызуе сабою працэс карэннага пераабсталяваньня тэхнічнай базы прамысловасьці БССР (гл дыяграму).

Ажыцьцяўленьне высокіх тэмпаў разгортваньня прамысловасьці прыводзіць да значнага ўзмацненьня яе ролі ў народнай гаспадарцы краю. Гэта роля, вызначаная ў процантах, была ў 1926-27 г.—30,2 проц., у 1927-28 г.—30,3 проц., у 1928-29 г.—34,5 проц. і ў 1929-30 г. паводле прамфінпляну — 43,8 проц. Роля буйнай прамысловасьці ў гэтым-ж гады вызначаецца адпаведна: 18,3—16,8—22,5—31,7 проц.

Паданыя паказальнікі выразна выяўляюць усю глыбіню і інтэнсіўнасьць працэсу зьмены народна-гаспадарчай структуры БССР, які ідзе ў адпаведнасьці з асноўнымі ўстаноўкамі пяцігадовага пляну.

Што паказвае другі год пяцігодкі

Выкананьне прамфінпляну ў бягучым годзе, мяркуючы паводле даных за 7 месяцаў, характарызуецца ростам прадукцыі супроць адпаведнага пэрыяду мінулага году на 70,4 проц., замест росту ў 77,5 проц., запраектаванага прамфінплянам. Дасягнуты прамысловасьцю ўзровень прадукцыі значна перавышае меркаваньні пяцігадовага пляну, адпак, гэты ўзровень усё-ж паказвае адставаньне ад гэтага пляну. Яшчэ больш істотнае адставаньне ёсьць на групе якасных паказальнікаў (якасьць прадукцыі, зьніжэньне сабекошту). Зьніжэньне сабекошту склала за першае паўгодзьдзе каля 7 проц., супроць 11 проц. паводле пляну. Хаця размер зьніжэньня сабекошту ў першай палове бягучага году значна вышэй таго-ж пэрыяду мінулага году (2 проц.), адпак, адставаньне ад пляну тут таксама яшчэ вельмі значнае.

Колькасьць прадпрыемстваў рэспубліканскай прамысловасьці, якія перайшлі на бесьперапынны рабочы тыдзень, складала на 1 мая 82 адзінкі з агульнай колькасьцю рабочых у 29.500 чалавек, або 68,3 проц. усіх рабочых рэспубліканскай прамысловасьці. Такім чынам, дырэктыва на ахваце бесьперапынкай да канца году 80 проц. рабочых выконваецца з посьпехам.

На скарочаны рабочы дзень пераведзена на 1 мая 21 прадпрыемства з агульнай колькасьцю рабочых у 9.600 чалавек, што складае 22,3 проц. усёй масы занятых рабочых.

Кажучы аб выніках разгортваньня прамысловасьці БССР за першыя два гады пяцігодкі, неабходна адзначыць значнае ўзмацненьне сацыялістычнага сэктару ў прамысловай гаспадарцы краіны. Роля прыватнага сэктару ў буйнай прамысловасьці ў сучасны момант зьведзена да нуля.

Што-ж датычыць саматужнай прамысловасьці, дык тут мы маем інтэнсіўнае разьвіцьцё працэсаў каапэраваньня. За два гады мае месца рост занятых асоб у арцелях, аб'яднаных сампрамкаапэрацыяй, у 3,2 разы, у той час, як пяцігадовым плянам вызначаўся рост у 2,6 раз. Рост валавой прадукцыі арцеляў за два гады павінен скласьці 250 проц. супроць 160 проц., паводле пяцігадовага пляну (даныя за 1929-30 г. паводле кантрольных лічбаў).

Ход выкананьня пяцігадовага пляну намячае тэмп разгортваньня прамысловасьці на 1930-31 год. Паводле папярэдняга праектаваньня, у 1930-31 г. колькасьць прадукцыі беларускай прамысловасьці будзе надвоена. Аб'ём прадукцыі трэцяга году пяцігодкі ў сваім абсалютным выразе перавышае заданьні пяцігодкі на яе апошні год г. зн. на 1932-33. Гэты рост прадукцыі апіраецца на ўзмоцненую актыўнасьць рабочае клясы і на рэальныя вытворчыя магчымасьці, забясьпечваючы далейшае ўзмацненьне тэмпаў разьвіцьця прамысловасьці БССР.

У адпаведнасьці з аб'ёмам вытворчасьці, рост колькасьці рабочых, паводле папярэдніх меркаваньняў, складзе ў 1930-31 г. у рэспубліканскай прамысловасьці звыш 50 проц., а рост прадукцыйнасьці працы — каля 39 проц.

З улікам росту аб'ёму капітальных укладаньняў 1930-31 году на рэспубліканскай прамысловасьці, які перавышае ўкладаньні бягучага году больш чым у два разы, прамысловая пяцігодка будзе фактычна рэалізавана на працягу трох год як у адносінах выпуску прадукцыі, так і на лініі капітальных укладаньняў.

Пакрыем Беларусь электрычнай сеткай

Згодна пяцігодкі, пуск першай раённай станцыі імя Сталіна быў прыстасаваны да сярэдзіны 1929-30 году. Станцыя пускаецца ў эксплёатацыю ў канцы другога году пяцігодкі. З. гэтай прычыны будзе некаторая недавыпрацоўка энэргіі супроць пляну, прычым гэтае адставаньне вызначыцца прыкладна ў 2-3 проц.

Але недавыпрацоўка па лініі раённых станцый у значай ступені накрываецца павялічэньнем інтэнсіўнасьці фабрычна-заводзкіх электрычных станцый, якія дадуць у 1929-30 г. павялічэньне выпрацоўкі энэргіі супроць меркаваньняў пяцігодкі амаль на 9 мільёнаў кілёват гадзін.

У адносінах-жа разьвіцьця будаўніцтва электрычных станцый назіраецца наступнае: па раённых сельскіх станцыях некаторая павольнасьць тэмпу будаўніцтва, што зьвязана з арганізацыйнай непадрыхтаванасьцю адпаведных апаратаў. Будаўніцтва мясцовых і прамысловых станцый ідзе па шляху ўзбуйненьня гэтых станцый супроць меркаваньняў пяцігадовага пляну. Прыкладам тут можа служыць ход будаўніцтва станцый па Менску, Гомелі, Бабруйску і Магілеве.

У адпаведнасьці з інтэнсіўным ростам патрабаваньняў у электраэнэргіі, капітальныя ўкладаньні ў справу электрыфікацыі на 1929-30 год значна вышэй укладаньняў, намечаных пяцігодкай (16.700.000 руб. супроць 10,800.000 руб.).

Разьвіцьцё сацыялістычнага будаўніцтва БССР, якое прыкмента перавышае ў сваім тэмпе маштабы пяцігодкі, высоўвае неабходнасьць фарсаванага разьвіцьця энэргетычнай базы БССР. У сучасны момант Дзяржплянам БССР перагледжаны тэмпы разгортваньня электра-будаўніцтва на адрэзак часу, які застаўся да канца пяцігодкі (1930-31-32-33 г. г.). Аб пэрспэктывах, якія зараз намячаюцца, дае прадстаўленьне карта электрыфікацыі БССР.

Капітальныя ўкладаньні ў рэспубліканскую прамысловасьць

Сельская гаспадарка

Асноўным вынікам выкананьня пяцігадовага пляну ў галіне сельскай гаспадаркі зьяўляюцца рэзультаты, якія дасягнуты па лініі калектывізацыі. Пяцігадовым плянам было вызначана давесьці ролю аграмаджанага сэктару ў пасеўнай плошчы да 18 проц. у канцы пяцігодкі (16 проц. пад калгасамі і 2 проц. пад саўгасамі). Ужо першы год пяцігодкі вызначыў, што разьлікі пяцігадовага пляну ў гэтай галіне перавышаюцца. У першым годзе пяцігодкі ўдзельная вага пасеўнай плошчы пад калгасамі ўзрасла з 1,1 проц. да 4 проц., а ўсяго сацыялістычнага сэктару да 5,4 проц. 1929-30 год вызначыў далейшае надзвычай інтэнсіўнае разьвіцьцё працэсаў калектывізацыі. Да пачатку веснавой сяўбы ўзровень калектывізацыі ўжо прыкметна перавысіў меркаваньні кантрольных лічбаў. Процант калектывізаванай пасеўнай плошчы склаў у пачатку веснавой сяўбы, паводле даных Наркамзему, 18. Такім чынам, стаўка пяцігодкі па давядзеньне вагі сацыялістычнага сэктару ў вёсцы прыкладна да $^1/_5$, у выніку інтэнсіўнага працэсу перабудовы вытворчых адносін у сельскай гаспадарцы, аказваецца перавышанай. Тэмпы разгортваньня працэсу абагульненьня па БССР, якія выявіліся на працягу першага адрэзку пяцігодкі, забясьпечваюць правядзеньне суцэльнай калектывізацыі БССР у канцы пяцігодкі.

Сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі БССР ідзе побач з глыбокім клясавым зрухам у вёсцы, які адбываецца ў абстаноўцы ўзмоцненага супраціўленьня з боку кулацкіх пластоў вёскі.

Адзначаючы працэсы, якія мелі месца ў галіне сельскай гаспадаркі, неабходна спыніцца на адмоўных выніках у галіне жывёлагадоўлі. У выніку ўзмоцненага за бою жывёлы, які меў месца на працягу першай паловы 1929-30 году, канстатуецца прыкметнае зьніжэньне колькасьці паголоўя, асабліва па сьвінях і маладняку буйной рагатай жывёлы. Яясьпрыяючая дынаміка жывёлагадоўлі ставіць ва ўвесь рост праблему жывёлагадоўлі, як адну з цэнтральных задач сельскай гаспадаркі БССР.

Рост пасеўнай плошчы ад вясны 1928 году да вясны 1929 году вызначыўся ў два проценты, у тым ліку пад ільном у 9,1 проц. Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі дала рост у 1928-29 г. на 4,9 проц., а ў 1929-30 годзе (паводле меркаваньняў кантрольных лічбаў) на 5,1 проц., прычым прадукцыя збожжавых культур павысілася ў мінулым годзе на 10,5 проц., а ў бягучым годзе—на 11,4 проц., прадукцыя тэхнічных культур—на 14,9 проц. у мінулым годзе і на 16,4 проц. у бягучым годзе. Рост валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі, які ішоў па базе павышанага ўраджаю, абумовіў павялічэньне таварнай масы сельска-гаспадарчых прадуктаў.

Рост таваранасьці, а таксама новыя мэтады загатовак, якія ішлі на грунце павышэньня актыўнасьці бядняцка-серадняцкай масы вёскі, забясьпечылі выкананьне высокіх плянавых заданьняў. Так, загатоўкі збожжавых культур склалі ў 1929-30 годзе 104.000 тон супроць 20.400 тон у 1928-29 годзе, г. зн. перавысілі вынікі мінулага году амаль у пяць раз.

Загатоўкі ільну-сямя павысіліся з 10.208 тон у 1927-28 годзе да 14.544 тон у 1928-29 годзе і 26.841 тоны ў 1929-30 годзе, або за два гады на 163 проц. Загатоўкі ільну-валакна далі рост з 5.296 тон у 1927-28 годзе да 14 226 тон у 1929-30 годзе, або на 169 проц.

Што датычыць мерапрыемстваў у галіне сельскай гаспадаркі, дык разьвіцьцё іх ішло вельмі інтэнсіўным тэмпам. Асабліва трэба адзначыць рост трактаразабесьпячэньня БССР з 127 штук у 1927-28 г., да 1.190 шт. у 1929-30 годзе (паводле кантрольных лічбаў). Дынаміка трактаразабесьпячэньня паказвае, што меркаваньні пяцігодкі, якія вызначалі давядзеньне колькасьці трактараў у 1932-33 годзе да 745 шт., будуць выкананы са значным перавышэньнем.

Адставаньне ад пяцігодкі мае месца ў адносінах забесьпячэньня сельскай гаспадаркі мінэральным угнаеньнем, хаця ў апошнія два гады мы маем сыстэматычны рост.

Значны размах набылі агра-культурныя мерапрыемствы, накіраваныя на павышэньне ўраджайнасьці. Першыя два гады паказваюць інтэнсіўнае разьвіцьцё мерапрыемстваў у галіне мэліярацыі, якая мае вялізарнае значэньне ва ўмовах БССР. Агульнае прадстаўленьне аб аб'ёме гэтых мерапрыемстваў даюць лічбы, якія характарызуюць кошт праведзеных мэліярацыйных работ. За ўвесь пэрыяд да 1928-29 году ўсе выдаткі на справу мэліярацыі склалі 6.400.000 рублёў. У 1928-29 годзе выдаткавана каля 4.000.000 рублёў, а ў 1929-30 годзе паводле пляну мяркуецца выдаткаваць 10.000.000 рублёў.

Гэтыя зрухі ў галіне працы ўносяць грунтоўныя зьмены ў праектаваньне пяцігадовага пляну, які намячаў зьніжэньне беспрацоўя толькі да канца пяцігодкі.

Маняецца дзейнасьць органаў працы. Асабліва пашыраецца падрыхтоўка рабочай сілы. Замест падрыхтаваных у мінулым годзе 1.500 чалавек, плян бяку 19.000 чалавек, а плян 1930-31 году—42.000 чал., у тым ліку—каля 25.000 будаўнікоў.

У выніку інтэнсіўнага росту наёмнага пэрсаналу ідзе працэс уцягваньня членаў сем'яў рабочых у прамысловасьць і іншыя народна-гаспадарчыя галіны, што абумоўлівае сабой павышэньне дабрабыту рабочае клясы ў сувязі з ростам сямейнага бюджэту, і паскарае працэс рэканструкцыі рабочага быту. Разам з тым павялічэньне колькасьці рабочае клясы падымае значэньне жаночай працы, высоўваючы рад задач у гэтай галіне.

Паказальнікам паляпшэньня дабрабыту рабочай клясы, апрача росту зарплаты, зьяўляецца буйнае разьвіцьцё мерапрыемстваў у галіне сацыяльнага страхаваньня. Бюджэт сацыяльнага страхаваньня БССР павышаецца з 14.400.000 руб. у 1927-28 годзе, да 24.800.000 руб. у 1929-30 годзе, ці на 72 проц. за два гады, прычым максымальнае разьвіцьцё набываюць асыгнаваньні на мэдычную дапамогу (на 80 проц. за два гады) і на капітальнае будаўніцтва, зьвязанае з прафілактычнымі мерапрыемствамі (з 565.000 руб. у 1927-28 г. да 2.345.000 руб. у 1929-30 годзе).

На шляху да поўнай ліквідацыі беспрацоўя

У адпаведнасьці з тым, што разьвіцьцё прамысловай вытворчасьці і іншых галін народнай гаспадаркі ідзе ў тэмпах, якія перавышаюць праектаваньне пяцігадовага пляну, дынаміка працы дае таксама малюнак прыкметнага апярэджаньня намячэньняў пяцігадовага пляну.

Колькасьць фабрычна-заводзкага пралетарыяту БССР, якая складала на 1 кастрычніка 1927 году 28.800 чалавек, павысілася да 1 красавіка 1930 году да 52.600 чалавек, г. зн. амаль што падвоілася.

Колькасьць беспрацоўных, паводле даных на 1 мая бягучага году, складала толькі 19.800 чалавек, г. зн. на 47 проц. ніжэй колькасьці беспрацоўных на 1 мая мінулага году. Фактычнае зьніжэньне колькасьці беспрацоўных значна большае, бо ў складзе зарэгістраваных ёсьць зараз каля 6.500 чалавек, якія знаходзяцца на розным роду курсах па перападрыхтоўцы.

Расьце таваразварот

На працягу першых двух год пяцігодкі ў выніку ўзмацненьня і пашырэньня работы каапэрацыі, на рынку мела месца рэзкае скарачэньне долі прыватнага сэктару як у загатоўчай дзейнасьці, так і ў галіне пасярэдніцкага таваразвароту, прычым тэмпы скарачэньня работы прыватніка прыкметна перавышаюць меркаваньні пяцігадовага пляну. Пяцігодкай меркавалася зьніжэньне удзельнай вагі прыватнага сэктару ў раздробным звароце з 29,6 проц. да 12,8 проц. у 1932-33 годзе. Ужо ў 1928-29 годзе мы мелі значнае скарачэньне ролі прыватніка ў таваразвароце, а 1929-30 г. даў далейшае інтэнсіўнае разьвіцьцё тэндэнцыі, якія вызначыліся ў сацыяльным складзе пасярэдніцкага таваразвароту. Роля прыватніка ў раздробным гандлі ў сучасны момант вызначаецца ў вельмі нязначных велічынях, якія значна ніжэй адпаведных меркаваньняў пяцігодкі на яе апошні год.

Буйны ўздым народнай асьветы

Разьвіцьцё культурна-асьветных мерапрыемстваў у асноўным ідзе ў адпаведнасьці з меркаваньнямі пляну, прычым па рэдзе элементаў плян выкон-

Фінансавы плян

Высокія тэмпы разьвіцьця асноўных галін народнай гаспадаркі, паскарэньня працэсаў аграмаджаньня народнай гаспадаркі — абумоўліваюць і перавыкананьне фінансавага пляну. Так, агульны фінансавы плян па першыя тры гады пяцігодкі вызначаўся пры яго складаньні: для мінулага году — 213,700.000 руб., у бягучым годзе — 301.600.000 руб. і на 1930-31 год — 349.500.000 руб. Першы год пяцігодкі даў перавыкананьне фінансавага пляну на 8 проц., магчымае перавыкананьне бягучага году — каля 20 проц., а папярэднія меркаваньні аб фінансавым плане 1930-31 г. даюць арыентовачную суму каля 800.000.000 рублёў, г. зн. павялічэньне фінансавых плянаў, запраектаваных пяцігодкай на гэты год, больш чым у два разы.

Каля паловы сродкаў, улічаных фінплянам, прыпадае на дзяржаўны (рэспубліканскі) і мясцовы бюджэт. Зводны бюджэт БССР (рэспубліканскі і мясцовы) з 81.400.000 руб. у 1927-28 г. дасягнуў [illegible] руб. [illegible] 1929-30 [illegible] выходзіў з пра[illegible] зацыі сродка[illegible] не плану [illegible] апярэдзіць [illegible] прырост за [illegible] кі каля 21 [illegible] мільён. руб. [illegible] ну.

Значна павысілася [illegible] меркаваньняў пяцігодкі [illegible] дзяржаўных [illegible] пазыка на 27 [illegible] выкананьне фінансавага [illegible] ку ў справе [illegible] [illegible] ідзе [illegible]

Асноўныя вывады

Балянс вынікаў народна-гаспадарчага разьвіцьця БССР за першыя два гады паказвае перавыкананьне намячэньняў пяцігодкі па радзе рашаючых паказальнікаў як па лініі матар'яльнай рэканструкцыі (у першую чаргу ў прамысловасьці), так і па лініі сацыяльных зрухаў (у сельскай гаспадарцы, прамысловасьці, таваразвароце).

Адставаньне ад пяцігодкі на некаторых вучастках (асабліва на лініі разьвіцьця жывёлагадоўлі) можа і павінна быць у выніку актывізацыі адпаведных мерапрыемстваў ліквідавана на працягу бліжэйшага часу.

Аналіз паданых вынікаў выкананьня пяцігадовага пляну паказвае ўсю рэальнасьць намечанай у ім праграмы сацыялістычнай перабудовы гаспадаркі БССР. Лёзунг рабочай клясы — «Пяцігодку—за чатыры гады» — апраўдваецца фактычным ходам рэалізацыі заданьняў пяцігодкі.

Вядучы рашучую барацьбу з правым ухілам, які зьяўляе[illegible] галоўнай небясьпекай у сучасны [illegible] і яго спэцыфічнымі правымі [illegible] (нацыянал-дэмакратызм [illegible] апартунізмам і нашы[illegible] выглядах), а таксама і [illegible] «левым» апартунізмам і рэшткамі [illegible] нага трацкізму, рабочая кляса БССР, пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі, пры актыўным [illegible] садзейнасьці рабочае клясы [illegible] Савецкага Саюзу, пасьпяхова перамагае гаспадарчую адсталасьць [illegible] БССР, ажыцьцяўляючы на справе, [illegible] ня гледзячы на ўсе труднасьці, дырэктыву XV зьезду УсеКП(б) аб неабходнасьці ліквідацыі эканамічнай і культурнай адсталасьці нацыянальных акраін і раёнаў і XII зьезду КП(б)Б аб максымальным узьдыме гаспадаркі краіны.

Выкананьне асноўных эканамічных і сацыяльных установак пяцігодкі забясьпечвае значныя посьпехі народнай гаспадаркі БССР.

Дынаміка валавой прадукцыі галін буйнай прамысловасьці ў параўнаньні з пяцігодкай



НА ЗАВАЯВАНАЙ ЗЯМЛІ

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

1. СТОГНЕ БАЛОТА

Адзін з магістральных каналаў на Мар'іне

гэкт. плошчы БССР—балоты і забалочаныя. Значае што пятая частка рэспублікі ня ўцягнута ў гаспадарчы зварот. Асобныя вобласці выяўляюць сабою ня пустку, у якіх пануюць лес і камары.

Лукі, раскіданыя ў гэтых ...ганыя астраўкі. Бадай ...т жыве чалавек, адарваны ад культуры. 9 месяцаў ён ...леча і некультурнасьць садзейнічалі за...кабаленьню сялян памешчыкамі. Беларускі селянін да самага апошняга дня падзеньня царызму быў фактычна нявольнікам свайго пана. Цярпячы ад беззямельля і малазямельля, ён вымушаны быў за нікчэмную аплату працаваць на памешчыка, на суседа-кулака.

У 70-х гадох мінулага сталецьця царскі ўрад, пад націскам памешчыкаў, зьвярнуў увагу на закінуты Заходні край. Памешчыкі цярпелі ад вялізных балот, якія ўваходзілі ў склад іх маёнткаў. Зямельныя магнаты не маглі эксплёатаваць багатыя лясы Палесься і інш. балотныя масывы. Перашкаджала разьвіцьцю мора. Да лесу нельга было прабрацца. Гатовы матар'ял ня вывозьці. Выключна з гэтай мэтай Пецярбург і парашыў увяцца за мэліярацыю Палескай пушчы. Арганізуецца славутая экспэдыцыя генэрала Жылінскага. 10 год вяліся рэкагнасцыровачныя работы. У Палесьсе заганяліся тысячы людзей. Жабрацкая аплата. Катаржныя ўмовы працы. Але задачу выканалі: да 1898 г. было пракапана каля 5.000 кілёмэт. сплаўных каналаў. Палескаму лесу адкрыўся шырокі доступ на замежны рынак. Паны нажывалі мільёны. Беларускія сяляне і надалей жылі ў беднасьці. Ящчэ больш узмацнілася эксплёатацыя іх.

Царская мэліярацыя нічога ня дала шырокім сялянскім масам. Толькі на берагох канаваў вырасьлі сьвежыя магілы соцень батракоў і беднякоў, якія ад хвяравай катаржнае працы і цяжкіх хвароб.

Перанаселенасьць Беларусі не паменшылася ў выніку царскай мэліярацыі. Палесьсе не магло быць уведзена ў культурны сельска-гасп. зварот, бо аб сапраўднай асушцы плошчы паміж канавамі ніхто і ня думаў. Капаньне сплаўных каналаў не палепшыла культ.-гаспадарчага ўзроўню паляшукоў. Галодны беларускі селянін езьдзіў а бацькаў шчыны шукаць шчасьце ў Сібір, Амэрыку. Разбазарваньне лясоў — гэтага народнага добрабыту краю — ішло ва ўсю.

Кастрычнік у жорсткіх баёх заваяваў Палескую пушчу. Дыверсыйныя банды, «бацька» Вулак-Балаховіч, падтрыманыя мясцовым кулацтвам, у балотах прабавалі стварыць апору контр-рэвалюцыі. Нескалькі год упартай барацьбы пайшло на ліквідацыю рэштак белагвардзейшчыны. Савецкая ўлада паступова сваімі шчупальцамі ахапляла Палесьсе. У буйных населеных пунктах, дзе толькі дазвалялі мясцовыя ўмовы, арганізоўваліся камітэты, будаваліся больніцы, адкрываліся школы, нардамы, хаты-чытальні. Але ўсім гэтым не маглі карыстацца балотныя людзі, раскіданыя па дробных астраўках, якія ня маюць магчымасьці 3/4 году зносіцца нават з бліжэйшай вёскай.

Кастрычнік перадаў сялянству паменчыцкія землі. Але гэта не магло вырашыць праблемы беззямельля і беспрацоўя ў беларускай вёсцы, таксама як і перасяленьне ў далёкую Сібір. **І партыя знайшла выхад, які ў значнай ступені вырашае векавое балючае пытаньне. Камуністычная партыя парашыла ажыцьцявіць сьмелы і грандыёзны плян—на працягу 15 год асушыць усе балоты Савецкай Беларусі.**

Гэта азначае, што праз паўтара дзесяткі год усе 2.663.020 гэкт. балот павінны быць асушаны, уведзены ў сельска-гаспадарчы зварот, калянізавны.

Гэта азначае ня толькі надзяленьне зямлёй беззямельных, зьмякчэньне беспрацоўя ў вёсцы, але і хуткае культурнае гаспадарчае разьвіцьцё ўсіх беларускіх прастораў на базе буйное калектыўнае гаспадаркі.

Гэта азначае стварэньне новых тысяч буйных калгасаў і саўгасаў, соцень магутных фабрык і заводаў.

Генэральны плян мэліярацыі БССР, выпрацаваны ўрадам Савецкай Беларусі — дзёрзкі выклік капіталістычнаму сьвету.

Сацыялістычнае будаўніцтва ўжо ідзе некалькі год. Крок за крокам у стыхіі адваёўваецца Палеская пушча. Туды кінуты людзі, машыны, грошы. На працягу пяцігодкі дзяржава выдаткуе на мэліярацыю (толькі на галоўныя каналы) 50,000 руб. Прыцягваюцца і сродкі самога насельніцтва. Ідзе асушка балот адначасова ў большасьці акруг Беларусі. У радзе месц дасягнуты грандыёзныя вынікі. Аб гэтым гаворыць мэліярацыя Мар'інскага балотнага масыву — частка Палесься, дзе ўжо створаны саўгас на 8.000 гэкт., камуна на 2.500 гэкт. і рад калгасаў.

Беларусь стала шырока ўжываць торф для прамысловых мэт. Арганізацыя рацыянальнай распрацоўкі і скарыстаньня яе 520 тысяч гэкт. тарфяных балот абяцаюць краю бліскучыя перспэктывы. Паводле самых прыблізных падлікаў залежы торфу ў БССР выдзяваюцца ў 12.020.000.000 кубамэтраў.

На базе торфу параджаецца рад буйнейшых прадпрыемстваў. Восеньню над Воршай адкрываецца 1-я Беларуская раённая электрастанцыя імя Сталіна (Асінбуд), пабудаваная на вялізным Асінаўскім балоце. Дзікае балота ў некалькі сот кв. кілёмэтраў абярнулася ў квітнеючы сацыялістычны цэнтр. Прыгожыя шасэйныя дарогі, добра-пабудаваныя кватэры, вялізны ўздым культурна-гаспадарчага ўзроўню навукольнага насельніцтва і самае галоўнае, дзесяткі тысяч кілёват энэргіі—усё гэта заклікала да жыцьця тарфяное балота.

Асінбуд зробіць вялізарны ўплыў на сельскую гаспадарку акругі. Даволі адзначыць, што ў наступным годзе маркуецца правядзеньне досьледу электрапахаці ў Дубровенскім раёне. Сюды праводзіцца электра - магістраль з Асінбуду.

У гэтым годзе пачынаецца пабудова 2-й Беларускай раённай электрастанцыі пад Гомелем. І яна будзе працаваць на торфе.

У Полацкай акрузе будуецца спэцыяльны завод па вырабе з торфу будаўнічых пліт і падсьцілак. Пабудова такіх заводаў вызначаецца і ў інш. акругах.

Торф, нарэшце, дае магчымасьць Беларусі перайсьці на шырокае ўжываньне яго ў якасьці ўгнаеньня ў сельскай гаспадарцы.

Ул. ЛІЛІН.

Камунарка з чырвонаармейскай камуны імя БВА на Мар'іне



Дыскаваньне на асушаных палёх камуны імя БВА

25-гадовы юбілей народнага паэты Янкі Купалы

На вечары, прысьвечаным юбіляру

28-га мая адбылося 25 год літаратурнай працы народнага паэты БССР Янкі Купалы. Для ўшанаваньня гэтай падзеі Народны Камісарыят Асьветы і Дом Пісьменьніка арганізавалі ў Доме Асьветы ўрачысты вечар, прысьвечаны 25-гадоваму юбілею Янкі Купалы.

Заля Дому Асьветы, упрыгожаная чырвонымі палотнішчамі з лёзунгамі і ўрыўкамі з апошніх твораў Я. Купалы і партрэтамі правадыроў і юбіляра, была перапоўнена. Бурнымі воплескамі быў спатканы юбіляр на сцэне. У прэзыдыум былі запрошаны прадстаўнікі ад партыйных, прафсаюзных і пісьменьніцкіх арганізацый.

З уступным прывітальным словам выступіў народны камісар асьветы БССР **тав. Платун.** Сьцісла т. Платун паказаў тое асьвядзішча, у якім жыў і тварыў на... і той шлях, якім прайшоў Янка Купала за 25 год сваёй паэтычнай творчасьці.

— Вясковая беднота—вось каго апляваў Купала ў пачатку свайго творчага шляху. Беспрасьветная рэакцыя, што наступіла пасьля рэвалюцыі 1905 году, адбілася на творчасьці Купалы ў бок песімізму, журбы. Купала падпадае пад уплыў нацыянальнай ідэалёгіі. Ён пачынае сьпяваць песьні наогул беларушчыне, беларускаму народу, бяз клясавага падзелу. Такія-ж песьні ён пае і ў пачатку Кастрычніцкай рэвалюцыі. Але посьпехі ў рэканструкцыі нашай народнай гаспадаркі, над выпрабаваным кіраўніцтвам камуністычнай партыі, індустрыялізацыя краю і калектывізацыя сельскай гаспадаркі—пераконваюць песьняра ў тым, што шлях, паказаны ленінскай партыяй, адзіна правільны і толькі па ім аспоўныя масы сялянства выйдуць з беднасьці і напоўгалоднага існаваньня. І Янка Купала пачынае перастройваць сваю творчасьць на новы лад, ён пачынае апяваць новую калектыўную вёску.

З дакладам аб творчым шляху Янкі Купалы выступіў праф. БДУ **М. Піотуховіч.** У сваім дакладзе праф. Піотуховіч даў падрабязны аналіз творчасьці Купалы на розных яе этапах.

Пасьля дакладу былі прачытаны шматлікія прывітаньні, якія юбіляр атрымаў ад розных навуковых і пісьменьніцкіх арганізацый і ўстаноў, а таксама ад многіх выдатных навуковых працаўнікоў і пісьменьнікаў: ад т. т. **Луначарскага, Фэлікса Кона, Халатава, Пятро Панча** і інш. Прывітаньне ад СНК БССР прачытаў т. **Ульянаў.** Ад Беларускай Акадэміі Навук юбіляра пітаў т. **Ігнатоўскі,** ад БелАПП'у—т. **Александровіч,** ад «Узрышша» — т. **Глебка,** ад БДВ—т. **Некрашэвіч,** ад яўрэйскай сэкцыі БелАПП'у—т. **Харык,** які пракароткага прывітаньня прачытаў пераклядзены ім на яўрэйскую мову верш Купалы «Дыктатура працы». Якуб Колас прачытаў свой верш, прысьвечаны 25-гадоваму юбілею Янкі Купалы, які мы тут і ньмашчаем, а таксама выступіў з вершам В. Макараў. Замест адказнага слова з лістом у рэдакцыю выступіў юбіляр Янка Купала.

У адзнаку 25-гадовага юбілею Янкі Купалы БДВ устанавіла адну стыпэндыю імя Купалы на літаддзяленьні пэдфаку БДВ, 2 стыпэндыі—Наркамасьветы і 2 стыпэндыі—Дзяржвыдавецтва РСФСР.

Пасьля ўрачыстай часткі адбыўся канцэрт, наладжаны сіламі Музтэхнікуму, беларускай і яўрэйскай капэлы, якія выканалі рад твораў Янкі Купалы, пераложаных на музыку.

П. Ж.

Якуб Колас

ЯНКУ КУПАЛЕ

(Да 25-годзьдзя літаратурнай дзейнасьці)

Была пара. Марнелі нашы гоні
У холадзе жыцьцёвых непагод.
Ішоў за годам год,
Маўчаў, цярпеў народ,
Зацісьнуты, задушаны прыгонам.
Была пара. Зьнямела слова ў кра
Пад уціскам жандарскае нагі,
У полагу смугі
Разьлівамі тугі
Зьвінеў наш сум на гусьлях-самаграях
Журыліся і плакалі іх струны,
Ды слухалі іх толькі дзірваны,
Балоты, курганы,
Ды ў межах палыны,
Карчма-ж была і школа і трыбуна,
Ды час прабіў, і волі промень глянуў,
Вясёлкаю прарваўшыся з-за хмар.
Знайшоў ты шлях, пясьняр
Пакрыўджаны свой дар
Панёс, ты, голасам трыбуны і баяна.
Грымеў твой кліч, іскрылася крыніца
Адточаных, як меч, і выкаваных слоў.
У словах тых была—
Нядоля наша,—зло
І заклікі да яснай зараніцы.
Прайшлі гады, Магутны віхар дунуў
Уцемру—ноч адвечнае жуды
Самкнуліся рады
Працоўнай грамады
Пад пёзунгам сусьветнае камуны,
Упаў тыран. Адчынены дарогі:
Мільёны мас—дзяржава і ўладар...
Грымі-ж яшчэ, пясьняр!
Нясі працоўным жар—
Грамчэй заві да новай перамогі.

24/V—1930 г.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

(Замест прамовы на сходзе ў Доме Працасьветы 28-V 30 г.)

Паважаны рэдактар! Надрукуйце, калі ласка, у сваёй газэце ніжэйпадае:

Дарагія таварышы! Пры Савецкай уладзе я пражыў усяго толькі дзьве пяцігодкі і пачаў трэцюю, і ўжо ў такі кароткі тэрмін і ўлада і працоўнае грамадзянства Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі аддае сваю вялікую ўвагу і праўдзівую прыхільнасьць да маёй скромнай пісьменьніцкай працы, спраўляючы ўрачыста ў другі раз мой літаратурны юбілей.

Юбілеі, таварышы, я не сказаў-бы, каб падта была вялікая пацеха для таго, каму яны прысьвечаны—мінулыя гады не вяртаюцца! але, аднак, для мяне гэта—вялікае і надзвычайнае шчасьце, бо юбілей мой праходзіць у краіне, дзе вызваленыя з-пад нявольніцтва людзі будуюць супольна новае, ня рабскае жыцьцё.

У другі раз юбілейных угодкаў мне прыходзіцца выказваць перад усім сьветам сваю бязьмерную ўдзячнасьць і Савецкай уладзе і савецкай грамадзкасьці за ўсё тое добрае і радаснае, што я атрымаў па зямлі, над якой сонечна красуецца непакорны сьцяг непераможнага Кастрычніка.

Я кажу, таварышы, што пакуль хопіць маіх сіл, я ня сыйду з таго шляху, па якім ішоў да сёньняшніх векапомных бурлівых дзён,—заўсёды наперад і наперад! Бяда і гора маё і ўсяго працоўнага люду беларускага адыходзіць ўсё далей—у нябыт, а шпаркім крокам творыцца квацістае бясьпрыгоннае бытаваньне, абы толькі шчырай працай і безагляднай аддана сьцю Лепінскім заветам дапамагаць хутчэйшаму набліжэньню гэтае сьветлае часіны!

Мне толькі смутна, таварышы, што там—«за слупамі з арламі» — беларускі рабочы і сялянка-парабчанка ня толькі ня могуць спраўдзіць вольнаю ў грамадзе маёй гадавіны, але што там нават за чытаньне маіх друкаваных думак садзяць бязьлітасна ў вастрог.

Я пажадаю ад шчырага сэрца сваім малодшым таварышам-пісьменьнікам, каб яны дажылі сьвяткаваньня сваіх юбілеяў, калі ўжо там — «за слупамі з арламі» — пад беларускай вызваленай грамадою будзе разьвівацца чырвоны штандар з агністым надпісам—БССР!

***

Ад усяго сэрца дзякую савецкім і грамадзкім установам і арганізацыям, а таксама ўсім паасобным таварышом, якія так чула і прыязна ўспомнілі мяне добрым словам у час дваццаціпяцігадовага юбілею маёй літаратурнай працы на ніве беларускай.

Асобна тут выказваю сваю сардэчную ўдзячнасьць і падзяку за братнія павіншаваньні дарагім маскоўскім таварышом: Фэліксу Кону, А. Луначарскаму, Арц. Халатаву і інш.

Янка КУПАЛА.

Менск, 29-V 1930 г.

На 25 мая выканана 63,3 проц. засеўнага пляну

і гэта пяціднёўка ня дала пералому у засеве тэхнічных культур

Апэрацыйная зводка

Паводле даных Наркамзему на 25 мая, у БССР засеяна 1.476.027 гэкт., што складае 63,3 проц. агульнага пасеўнага пляну. Калгасамі засеяна 280.428 гэкт. (66,3 проц.), індывідуальным сэктарам — 1.195.599 гэкт. (62,7 проц.). На 20 мая засеяная плошча ў БССР складала 50,9 проц. пляну.

Па збожжавых культурах калгасы выканалі 73,1 проц. пляну, індывідуальны сэктар—64,8 проц.; па ільне калгасы—34,9 проц., індывід. сэктар—42,4 проц.; па канаплях калгасы—18,5 проц., індыв. сэктар—17,4 проц.; па бульбе калагасы—59,5 проц., індыв. сэктар—77,4 проц.; па адпагадовых травах (віцы, сэрадэлі) калгасы — 66,1 проц., індыв. — 50,4 проц.; па капюшыне калгасы—81,1 проц., індыв. сэктар—60,2 проц.; па іншых культурах калгасы—46,6 проц., індыв. сэктар—41,2 проц.

У сярэднім па абодвых сэктарах плян выкананы: па збожжавых культурах—66,2 проц., па ільне—41,3 проц., канаплях—17,5 проц., бульбе—74,2 проц., адпагадовых травах—55,1 проц., капюшыне—66,7 проц. і інш. культурах—46,5 проц.

Калі ўзяць даныя з асобных округ, дык атрымаецца такі малюнак: у Полацкай акрузе плян выкананы калгасамі на 67,7 проц., індыв. сэктарам —55,9 проц., у сярэднім па абодвых сэктарах—58,4 проц.; у Менскай акрузе калгасамі—63 проц., індыв. сэктарам—61,8 проц., у сярэднім па абодвых сэктарах—62,3 проц.; у Віцебскай акрузе калгасамі—67,1 проц., індыв. сэктарам—55,8 проц., у сярэднім—57,5 проц.; у Аршанскай акрузе калгасамі—56,3 проц., індыв. сэктарам—60,9 проц., у сярэднім—60,1 проц.; у Магілёўскай акрузе калгасамі—65,9 проц., індыв. сэктарам—62,6 проц., у сярэднім—63,1 проц.; у Мазырскай акрузе калгасамі—72,7 проц., індыв. сэктарам—66,4 проц., у сярэднім—67,7 проц.; у Бабруйскай акрузе калгасамі—67,3 проц., індыв. сэктарам—62,6 проц., у сярэднім—63,4 проц.; у Гомельскай акрузе калгасамі—77,3 проц., індыв. сэктарам—75,9 проц., у сярэднім—76,2 проц.

Зусім не здавальняючы ход сяўбы ільну і канапель у радзе округ. Так, у Полацкай акрузе плян у сярэднім выкананы па ільне — на 10,3 проц., па канаплях—20,6 проц.; у Віцебскай акрузе па ільне—26,6 проц., канаплях—14,3 проц.; у Аршанскай акрузе па ільне—на 42,9 проц., канаплях—6 проц.; у Менскай акрузе па ільне—40 проц., канаплях—17,9 проц. і г. д.

Па ільне, канаплях і бульбе калгасы ў большасьці округ усё яшчэ адстаюць у тэмне сяўбы ад індывідуальнага сэктару.

Адвод сенажацяй калгасам і індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам

Паводле пастановы СНК БССР, адвод сенажацяй калгасам і індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам павінен праводзіцца спрошчаным мэтадам, шляхам зямляпаказаньняў.

Адводы праводзяцца зямлеўпарадкавацелямі, а нескладаныя адводы—сіламі сельскіх саветаў.

У патрэбных вынадках зямельныя органы павінны рабіць сельскім саветам і насельніцтву тэхнічную і іншую дапамогу ў разьмеркаваньні сенажацяй паміж індывідуальнымі бядняцка-серадняцкімі дварамі, з суровым захаваньнем пры гэтым клясавага прынцыпу.

Пры адводзе сенажацяй калгасам павінна адначасова адводзіцца сенажаць індывідуальным бядняцка-серадняцкім гаспадаркам, выходзячы з фактычнага зямлякарыстаньня.

Сенажаці кулацкіх гаспадарак, як выселеных, а таксама і абрэзкі павінны быць нераданы калгасам, а пры адсутнасьці калгасаў блізка ад такіх сенажацяй--яны перадаюцца саўгасаў.

Адначасна СНК апстанавіў ужыць рашучыя меры барацьбы з натравамі сенажацяй, прыцягваючы патраўшчыкаў да адказнасьці. Усе спрэчкі, зьвязаныя з разьмеркаваньнем сенажацяй, канчаткова вырашаюцца РВК.

Узмацніць тэмп сяўбы тэхкультур

Тэлеграма т. т. Гея і Галадзеда

Сакратаром АК і старшыням АВК

На 25-га мая плян пасеву тэхнічных культур выканан на 28 проц., кораньплодаў—на 48 проц.

Тэмп сяўбы ідзе марудна. Плян зрываецца.

Катэгарычна прапануем прыняць рашучыя меры па забясьпечаньні выкананьня пляну сяўбы кораньплодаў і тэхнічных культур.

Выкананьне пляну 5-га чэрвеня тэлеграфна далажыць.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГЕЙ.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

ПРАМТАВАРЫ КАНТРАКТАНТАМ

Наркамгандаль, Белкаапсаюз і Беллаяводсаюз тэлеграфна паслалі ва ўсе акругі цыркуляр адносна забясьпячэньня кантрактантаў ільну і пяньки прамтаварамі і мануфактурай.

Пры падпісаньні дагавораў на кантрактацыю ільну і пяньки кантрактантам павінна быць гарантавана выдача авансам баваўняных і льняных тканін на суму да 10 руб. на гэктар. З гэтых 10 руб. на кожны гэктар кантрактанту безадкладна павінна быць выдана на 5 руб. прамтавараў з адзнакай у разьліковай кніжцы або разьлікавых лістках, якія выдаюцца кантрактантам.

Наркамгандаль прапануе акруговым арганізацыям скарыстаць для гэтай мэты ўсю мануфактуру, якая ёсьць на сяле, пакінуўшы мінімальную колькасьць для прэміяваньня загатовак шчаціны, кары, каменьняў і для забясьпячэньня сельскай беднаты і батракоў.

Выдача мануфактуры кантрактантам павінна быць шырока абвешчана насельніцтву праз друк, сходы і нізавы апарат.

Аргандлям запрапанавана мець сыстэматычны кантроль над правядзеньнем паказаных мерапрыемстваў.

Спажывецкім саюзам даручана тэрмінова праверыць ці хопіць мануфактуры, якая ёсьць на сяле, для здавальненьня кантрактантаў.

Перад адкрыцьцем політэхнічнага інстытуту

Разьмеркаваньне факультэтаў, правілы прыёму

ВСНГ БССР зацьвердзіў наступны склад факультэтаў і падзяленьняў політэхнічнага інстытуту:

Хэміка-тэхналёгічны факультэт будуцьцё мець наступныя аддзяленьні—харчовае (спэцыяльнасьць — брадзільная вытворчасьць); на харчовае адводзіцца прынята 60 чал. Сілікатнае (спэцыяльнасьцямі: шкляная і фарфорова-цэлюлёзная) — прынята 60 чал. Тарфяное аддзяленьне будзе прынята 30 чал.; аддзяленьне па спэцыяльнасьцямі: шпуговарнай і паліва; на аддзяленьне будзе прынята 60 чал.

Усяго на хэміка-тэхналёгічны факультэт прынята 180 чал.

Электра-тэхнічны факультэт будзе мець аддзяленьні: прыняты 60 чал. і сельскай электрыфікацыі — 30 чал.

Будаўнічы факультэт з аддзяленьнямі: фабрычна-заводзкага будаўніцтва на 60 чал., камунальнага будаўніцтва—30 чал., калгаснага будаўніцтва — 30 чал., шляхавага будаўніцтва — 30 чал. і жыльлёвага будаўніцтва — 30 чал.

Прадугледжваецца таксама адкрыцьце скуранога аддзяленьня пры хэмфаку на 30 чал. і тэкстыльнага аддзяленьня на 60 чал.

Усяго ў першую чаргу будзе прынята 180 чал., прычым на хэміка-тэхналёгічны факультэт — 60 чал., мэханічны — 30 чал., электра-тэхнічны — 30 чалавек і будаўнічы — 60 чал. Заняткі для гэтай катэгорыі пачнуцца ў верасьні м-цы.

Далейшыя прыёмы адбудуцца ў сьнежні і ў сакавіку.

Прэзыдыум ВСНГ лічыць патрэбным пры прыёме ў ВТНУ надаць ільготы практыкам, якія працуюць на фабрычна-заводзкіх прадпрыемствах на пасадах сярэдняга і вышэйшага тэхнічнага, на менш 3 год. Акрамя гэтага, на думцы ВСНГ, павінны быць прадстаўлены ільготы таксама і вынаходцам, якія далі каштоўныя вынаходніцтвы.

Падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі фактычна не пачалася

Правядзеньне ўборачнай кампаніі — адна з аспоўных задач ня толькі зямельных органаў, але і каапэрацыйных сыстэм і, у прыватнасьці, с.-г. каапэрацыі. Сыстэма с.-г. каапэрацыі павінна асабліва быць падрыхтаванай да правядзеньня гэтай работы.

Як-жа рыхтуюцца да гэтай важнейшай кампаніі?

Да сучаснага моманту няма нават канкрэтнага пляну ўборкі ўраджаю. Пакуль ідуць яшчэ ведамственыя спрэчкі, а плянаў няма. Белсамрамсаюз, напрыклад, наогул не абгаварыў пытаньня аб сваім удзеле ва ўборачнай кампаніі і прыстасаваньні сваіх майстэрняў да рамонту ўборачных машын. Белкалгасцэнтр абмежаваўся цыркулярам. Наркамзем, Белкалгасцэнтр, Беллаяводсаюз зусім ня ведаюць, як ідзе падрыхтоўка да ўборачнай кампаніі на мясцох і ці наогул вядзецца такая падрыхтоўка.

Гэта ў той час, калі паводле дырэктыў партыі і савецкіх органаў, плян уборачнай кампаніі павінен быць даведзены да кожнага калгасу і двара да 15 чэрвеня.

Заказ такіх уборачных машын, як касаркі, жнеяркі прахоўзіць задавальняюча. Па касарках гадавы плян выкананы на 79 проц., па жнеярках — на 65 проц. Ня добра справа стаіць са спонавязалкамі і коннымі граблямі, якія не завезены ў БССР нават у тэй колькасьці, якая вызначана Саюзным Наркамзем. У БССР павінна быць адружана 95 спонавязалак і 1.085 конных грабель. Аднак, яшчэ не адгружана ні аднае машыны. Любярэцкі завод ня выканаў заданьня.

Вельмі слаба наступаюць запасныя часьці да ўборачных машын.

Ленін праходзіць паступленьне спонавязальнага шпагату і рэжучых мэханізмаў — камплектаў нажоў, сьцямэнтаў і г. д.

Загатоўлена 39 тон шпагату. На рэжучых мэханізмах заданьне выкананa на 90 проц.

На лініі Белпаляводсаюзу павінна было быць арганізавана да ўборачнай кампаніі 16 мэханізаваных майстэрняў для рамонту буйных складаных с.-г. машын. У зьвязку з позьнім наступленьнем абсталяваньня і нястачаю будаўнічых матар'ялаў ёсьць апаска, што да ўборачнай кампаніі плян арганізацыі мэханізаваных майстэрняў будзе выкананы ня больш як на 50 проц. Атрыманы толькі 9 камплектаў абсталяваньня і то няпоўных.

650 розных майстэрняў і кузьняў, якія ёсьць у БССР, забясьпечаны гатункоўым жалезам для рамонту толькі на 50 проц.

Наркамземам было дадзена заданьне мясцом высьветліць магчымасьць выкарыстаньня для рамонту ўборачных машын чыгуначных майстэрняў, але дасюль ні адна акруга не дала адказу. Ня высьветлена яшчэ пытаньне аб выкарыстаньні для рамонту шматлікіх навучальных майстэрняў Наркамасьветы.

Паводле дырэктыў рамонт уборачных машын павінен быць скончаны да 1-га ліпеня. Але ні адна арганізацыя ня ведае, колькі-ж машын у калгасах (не гаворачы ўжо аб індывідуальным сэктары) патрабуе рамонту. Ніхто не зацікавіўся гэтым пытаньнем.

Вырашэньне задач, зьвязаных з уборачнай кампаніяй, патрабуе максымальна выразных і баявых тэмпаў работы, тым больш, што часу для падрыхтоўкі засталося зусім мала.

Практыка веснавой пасеўнай кампаніі гаворыць аб тым, што работа некаторых каапэрацыйных арганізацый і, у прыватнасьці, спажывецкай каапэрацыі, па абслугоўваньні веснавой сяўбы была у многіх раёнах слабейшым вучасткам. Каапэрацыйны апарат на мясцох не праявіў патрэбнай гібкасьці і працаздольнасьці.

Сучасныя тэмпы падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі невыстарчальныя. Гэта пагражае паўтарэньнем веснавых недахопаў.

М. К—н.

Новы склад прэзыдыуму Дзяржпляну БССР

СНК зацьвердзіў наступны склад прэзыдыуму Дзяржпляну БССР: т. т. **Гольдэрг** (старшыня), **Гольдштэйн Пятровіч, Мачульскі, Пятрыкевіч** (гомельскі чыгуначнік)—намесьнікамі старшыні і т. т. **Каплан, Штыфман, Шэйнін, Утс, Кацнэльсон, Шындлер і Філіпаў**—членамі прэзыдыуму.

10 мільёнаў руб. на разьвіцьцё жывёлагадоўлі у калгасах

СНК пастанавіў адпусьціць дадаткова 9.571.000 руб. для далейшага гаспадарчага замацаваньня ўжо арганізаваных калгасаў і тых, якія арганізуюцца, галоўным чынам, на мерапрыемствы па разьвіцьці жывёлагадоўлі. Наркамзему даручана разьмеркаваць гэтыя сродкі па акругах.

Прызначэньні:

...ССР назначаны: рабочы-мэталісты) ... падрыхтоўчай ка... ндровіч (менскі ра... пікам старшыні ... руку і паліграфічны... ры СНК БССР; ...ректарам белаб...сэрваторыі і члена... інстытуту **Адамаў**—дырэктарам інстытуту старшыні гідрамэту пры СНК.

...перадаў на за... ньні т. т. **Бялугі** ...мі Наркамасьветы

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ

Дом Асьветы. У 19 г.—сход школьных цэх. яч КП(б)Б. Парадак дня: працоўка тэзісаў т. **Янаўлева** па рэканстр. с.-г. Якуба чл. яч. абавязкова, запрап. настаўн. Менску.

— **Агульны сход групкому № 7** саюзу Працасьветы ў **Доме Асьветы.** Пач. у 19 г. 30 м. Парадак дня: аб сельска-гаспадарчай выстаўцы, справаздача МЦРК і каап. упаўнаваж. Якуба абавязковая.

Акр. Інспэкт. Асьветы (пакой № 19). Нарада заг. вяч. школ павыш. тыпу. Пач. у 15 г.

ЗАЎТРА

Жакт № 4. Нарада камуністых—жыхароў жакту, якая не адбылася 28-га мая, пераносіцца на 31-е. Пач. у 19 г.

Аб'яднанае пасядж. сэкцый фізіятэрапэўтычнай і дзіцячых дактароў у Нэрвовай клініцы ў 20 г. 30 м.

Д-р Б. **Цыпкін**—Арганізацыя мер барацьбы са скрыўленьнем пазваночніка ў дзіцячым узросьце. Запрап. пэдагогі і фізкультурнікі.

Дом Асьветы. Вечар памяці **У. Маякоўскага,** які не адбыўся 11-га мая. Пач. 20 гадз. Білеты разданыя на 11-ае сапраўдны.

Нарада культпропаў па партасьвеце, прызначаная на 29 мая, пераносіцца на 15-е чэрвеня.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

«Зьвязда», Менск.

Менск, Галадзёдбел № 337.